Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

7 САКАВІКА 2017 г. АЎТОРАК № 45 (28409)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## НЕАЦЭННАЯ РОЛЯ ЖАНЧЫНЫ

***Дарагія суайчынніцы!***

*Прыміце шчырыя віншаванні з Днём жанчын.*

*Гэта свята — даніна ўдзячнасці і павагі нашым маці, жонкам, дочкам, сяброўкам і калегам. Яно прыходзіць да нас з першымі днямі вясны як сімвал адраджэння прыроды, перамогі прыгажосці і дабра.*

*Сёння мы дзякуем прадстаўніцам прыгожай паловіны чалавецтва за вялікі ўклад ва ўсе сферы жыцця грамадства. Неацэнная ваша роля ў развіцці айчыннай аховы здароўя і адукацыі, прамысловасці і сельскай гаспадаркі, культуры і навукі, сістэмы дзяржаўнага кіравання і бізнесу. Вы з'яўляецеся захавальніцамі сямейных каштоўнасцяў і перадаяце іх падрастаючаму пакаленню.*

*Дзякуй за вашу жыццёвую мудрасць і працавітасць, высокі прафесіяналізм і цудоўныя чалавечыя якасці. Няхай у вашых дамах пануюць утульнасць і цяпло, работа прыносіць задавальненне і пачуццё выкананага абавязку, а кожны новы дзень дорыць выдатны настрой.*

*Здароўя, шчасця і дабрабыту вам, вашым родным і блізкім.*

**Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

### *ЛІЧБА ДНЯ*

**1149 жанчын**

*прыпадае ў Беларусі на 1000 мужчын. Сярэдні ўзрост беларусак на пачатак 2016 года склаў 42,5 года, пры гэтым у гарадской мясцовасці — 41 год, у сельскай мясцовасці — 47,8 года. Як і ў іншых еўрапейскіх краінах, у Беларусі з кожным годам адсоўваецца ўзрост уступлення ў шлюб і нараджэння дзяцей. Так, у 2015 годзе сярэдні ўзрост уступлення ў першы шлюб сярод жанчын склаў 25,5 года, у паўторны шлюб — 37,8 года, а сярэдні ўзрост пры нараджэнні першага дзіцяці быў ужо 26 гадоў. Жанчыны складаюць 49,6% занятых у эканоміцы, яны працуюць практычна ва ўсіх сферах дзейнасці.*

Курсы замежных валют,
устаноўленыя НБ РБ з 7.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9031 | ▼ |
| Еўра | 2,0203 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0705 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# ЯНЫ Ж — НАВАТ МОЦНЫЯ — ТРОШКІ МІМОЗЫ. ІХ ТРЭБА ЛЮБІЦЬ НА ГЭТАЙ ЗЯМЛІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхары сталіцы Віталь і Яўгенія РАШЧЭНІ ў шлюбе пяць гадоў. А пазнаёміліся маладыя людзі і сталі сябраваць яшчэ са школы. Яны — аднакласнікі, заканчвалі школу ў Салігорску. Потым вучыліся — Віталь у радыётэхнічным, а Яўгенія — у політэхнічным каледжах. Цяпер у іх расце дачка Сафія.**

**Шчаслівую сям'ю Рашчэняў можна часта сустрэць на вуліцах сталіцы — па-ранейшаму яны любяць актыўны адпачынак і з задавальненнем катаюцца на роліках.**

■ Вясна ідзе!

## ПРЫЛЯЦЕЛІ ПЕРШЫЯ БУСЛЫ



**Сёлета белыя буслы прыляцелі ў Беларусь раней, чым звычайна, паведамляе прэс-служба грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ).**

Арнітолагі адзначаюць, што ўжо 4 сакавіка на ўскраіне Гродна былі заўважаныя чатыры белыя буслы, якія вярнуліся на радзіму з месцаў зімоўкі.

«У пачатку сакавіка мы можам бачыць белых буслоў, якія зімавалі непадалёк: у Паўднёвай Еўропе ці ў Егіпце, напрыклад, на знакамітым курорце Шарм-эш-Шэйх. А пачатак масавага прылёту мы чакаем у трэцяй дэкадзе сакавіка», — расказала **загадчыца лабараторыі арніталогіі НПЦ Нацыянальнай акадэміі навук па біярэсурсах Ірына САМУСЕНКА.** Птушкі не застануцца без ежы: яны могуць лавіць дробных грызуноў на палях і рыбу на вадаёмах. Акрамя буслоў, у Беларусь ужо вярнуліся першыя кнігаўкі, шэрыя жураўлі, палявыя і лясныя жаўрукі, а таксама шпакі. З кожным днём колькасць відаў птушак павялічваецца.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Юбілей

## ЛЕГЕНДАРНАЯ, НАША...



**Учора сваё 80-годдзе адсвяткавала адна з самых вядомых жанчын мінулага стагоддзя — наша зямлячка Валянціна Уладзіміраўна ЦЕРАШКОВА, Герой Савецкага Саюза, першая жанчына-касманаўт.**

Як адзначыў у сваім віншаванні **Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр ЛУКАШЭНКА**, «палёт першай у свеце жанчыны-касманаўта стаў адной з найбольш яскравых старонак у гісторыі скарэння космасу». «Сіла духу і настойлівасць у дасягненні пастаўленых мэт здабылі Вам высокі аўтарытэт, шчырую павагу калег і мільёнаў людзей ва ўсім свеце», — гаворыцца ў віншаванні. «Сёння вы прымаеце актыўны ўдзел у грамадска-палітычным і культурным жыцці сваёй краіны. Мы высока цэнім Вашу шматгранную дзейнасць, якая садзейнічае развіццю і ўмацаванню беларуска-расійскага сяброўства і супрацоўніцтва», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Валянціна Уладзіміраўна паходзіць з сям'і беларускіх сялян, з'яўляецца ганаровай грамадзянкай Віцебска. Легендарнай жанчыне прысвоены тытул «Найвялікшая жанчына XX стагоддзя».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

ЗВЯЗДА
*Да чытача з любоўю!*

**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,**
**5 разоў на тыдзень!**
**Пачалася падпіска на «Звязду» на II квартал 2017 года!**
**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# ЗОЛАТА НАЦЫІ

## Прэзідэнт сустрэўся з намінантамі на саісканне Дзяржпрэмій у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры

**Учора кіраўнік дзяржавы наведаў выстаўку ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета, дзе дэманстраваліся ўсе работы, прадстаўленыя на саісканне Дзяржаўных прэмій у галіне літаратуры, мастацтва, архітэктуры. Там жа, падчас канцэрта-прэзентацыі, былі паказаны фрагменты найлепшых спектакляў беларускіх аўтараў, рэкамендаваных да прысуджэння Дзяржаўнай прэміі.**

Усяго на саісканне ў названай галіне прадстаўлены восем работ. Кожная з іх у нечым — адлюстраванне нашай, беларускай, гісторыі.

Аляксандр Лукашэнка, наведваючы выстаўку, паразмаўляў з намінантамі — пра творчасць, ідэі, пра сённяшнія праблемы культуры. Так, дзяржаве неабходны такі мастацкі твор, які б па-сапраўднаму мог бы захапіць моладзь.

— *Хацелася б, каб мы знялі, — я не кажу фільм, мюзікл або оперу паставілі, — можа, гістарычнае або сучаснае. Але такое, каб народ валам валіў. Трэба так, каб захапіла і моладзь. Трэба такое стварыць*, — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кожны з намінантаў годны Дзяржаўнай прэміі, унёсак кожнага творчага калектыву больш, чым істотны.

Опера «Сівая легенда», прадстаўленая **творчым калектывам Вялікага тэатра оперы і балета**, пераносіць гледача ў далёкае XVII стагоддзе. Лібрэта напісаў наш класік Уладзімір Караткевіч. Спектакль абуджае патрыятызм, прыцягвае ўвагу да гісторыі Айчыны.

**Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Барыс Крэпак** вылучаны за стварэнне серыі кніг і альбомаў пра жыццё і творчасць дзеячаў культуры і мастацтваў нашай краіны. За кнігі для дзяцей «У родным краі», «Гульнясloў», «Серабрыстыя чайкі» намінуецца **Міхаіл Пазнякоў, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

**Кінарэжысёр Анатоль Алай** прэтэндуе на Дзяржпрэмію за стварэнне цыкла дакументальных фільмаў пра Вялікую Айчынную вайну. Падчас размовы з ім Аляксандр Лукашэнка прапанаваў кінарэжысёру зрабіць дакументальныя фільмы пра цяперашніх намінантаў. «Але трэба хутка, каб людзі не забыліся», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

**Кампазітар Уладзімір Кандрусевіч** вылучаны ў намінанты за стварэнне музыкі да балета «Мефіста» і да мюзіклаў «Шклянка вады», «Джулія», «Соф'я Гальшанская», «Байкер».

**Творчы калектыў Белдзяржфілармоніі** стаў намінантам за стварэнне канцэртаў-спектакляў тэтралогіі «Святое, незабыўнае...». **Творчы калектыў у складзе Генадзя Буралкіна, Валянціна Занковіча і Сталіна Федчанкі** вылучаны за стварэнне мемарыялаў і скульптурных груп пагранічнай тэматыкі ў перыяд з 2004 па 2011 год.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# НА РОЎНЫХ

## Сацыяльны і эканамічны статус жанчын узрастае

**Жанчын у Беларусі — 53,4% ад агульнай колькасці насельніцтва краіны, усяго на 1 студзеня 2017 года налічвалася 5,1 млн прадстаўніц прыгожага полу. Прычым іх сацыяльны і эканамічны статус у нашай краіне, на думку намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандра РУМАКА, з году ў год узрастае.**

Беларусь на сённяшні дзень, згодна са звесткамі Даклада аб чалавечым развіцці 2015 года, уваходзіць у лік 15 краін, дзе індэкс чалавечага развіцця жанчын роўны або перавышае аналагічны паказчык сярод мужчын. Аляксандр Румак лічыць, што гэта стала магчымым дзякуючы збалансаванай палітыцы дзяржавы ў сферы забеспячэння роўных правоў і магчымасцяў. Дарэчы, цяпер у нашай краіне прыняты пяты Нацыянальны план па забеспячэнні гендарнай роўнасці на 2017—2020 гады.

Ні адна са сфер дзейнасці не абыходзіцца без жаночага ўдзелу. Пры гэтым цяпер для Беларусі, як і для многіх еўрапейскіх дзяржаў, характэрна тэндэнцыя павелічэння сярэдняга ўзросту жанчын пры ўступленні ў першы шлюб, як і тэндэнцыя павелічэння сярэдняга ўзросту маці пры нараджэнні першага дзіцяці.

Разам з тым летась 117,8 тысячы беларусак сталі мамамі, прычым больш за 50% народжаных дзяцей аказаліся другім, трэцім і наступным дзіцем у сям'і.

Аляксандр Румак адзначае, што дзяржаўныя дапамогі атрымліваюць 558 тысяч дзяцей (гэта 30,6% ад агульнай колькасці непаўналетніх), а забяспечанасць дзяржаўнымі дапамогамі дзяцей ва ўзросце да трох гадоў дасягае амаль 100%.

Пры гэтым спецыялісты падкрэсліваюць, што сістэма дапамог сем'ям з дзецьмі пастаянна ўдасканальваецца. Напрыклад, у канцы мінулага года Палатай прадстаўнікоў у першым чытанні быў прыняты законапраект, што ўносіць навацыі ў Закон «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» і дзякуючы якому будзе ўзмоцнена сацыяльная абарона сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, а таксама сем'яў, у якіх самі бацькі з'яўляюцца інвалідамі.

Таксама ў нашай краіне цяпер рэалізуецца праграма сямейнага капіталу. Пачынаючы з 2015 года адкрыта 32 тысячы дэпазітных рахункаў на агульную суму звыш 320 млн долараў. Актыўна развіваецца і сістэма сацыяльных паслуг сем'ям з дзецьмі. Асабліва запатрабаваны сем'ямі паслугі сацыяльнай нянькі і сацыяльнага патранату.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Не абмініце!

### Задайце пытанне Леаніду Гуляке

**У чацвер, 9 сакавіка, з 10.00 да 12.00** жыхары нашай краіны змогуць напрамую звярнуцца да **Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леаніда Паўлавіча ГУЛЯКІ па тэлефоне 8 (017) 284-89-65.**

■ Падзея

# ТАК 100-ГОДДЗЕ АДЗНАЧАЮЦЬ ТОЛЬКІ Ў НАС

## Юбілей айчыннай міліцыі адсвяткавалі з размахам

**У беларускай сталіцы на Кастрычніцкай плошчы адбыўся ўрачысты марш, прысвечаны 100-годдзю заснавання беларускай міліцыі. Гэта падзея ўнікальная не толькі для нашай краіны, але і для ўсяго свету. У шэсці ўдзельнічалі прадстаўнікі самых разнастайных структур Міністэрства ўнутраных спраў — ад супрацоўнікаў ДАІ да спецыялістаў-кінолагаў, а таксама тэхніка розных эпох — ад легендарных аўтамабіляў «ГАЗ» да сучасных БТРаў і браніраваных іншамарак.**

Перад пачаткам шэсця Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прысутных са святам. Прэзідэнт адзначыў, што менавіта перад супрацоўнікамі МУС стаіць задача па ўмацаванні статуса нашай краіны як бяспечнай дзяржавы. Поспех у гэтым залежыць ад дакладнасці і зладжанасці іх дзеянняў, ад умення аналізаваць сітуацыю і прымаць выверaныя рашэнні. «Памятайце, што ў вашай працы няма месца нядбайнасці, некампетэнтнасці і абыякавасці. Ад гэтага залежыць вера людзей у здольнасць улады абараняць правы і свабоды грамадзян», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Ні адна паліцэйская структура свету такога мерапрыемства не праводзіла: у такім маштабе, каб удзельнічалі ўсе падраздзяленні Міністэрства ўнутраных спраў. Гэта зрабілі толькі мы. Урачысты марш, які атрымаўся амаль як ваенны парад, пераканаў усіх у тым, што страявая зладжанасць — адлюстраванне баявой зладжанасці, якая ёсць у міліцыі», — расказаў **Юрый КАРАЕЎ, намеснік міністра ўнутраных спраў, камандуючы ўнутранымі войскамі.**

Не горш за мужчын гэта пацвердзілі і прадстаўніцы слабага полу. Па словах Юрыя Караева, курсанткі Акадэміі МУС, якія маршыравалі ў складзе пешай калоны, у вольны час падлічылі, што ўсяго адбылося 48 трэніровак, падчас кожнай з якіх яны прайшлі ад 5 да 8 кіламетраў, з іх трацiна — страявым крокам. У цэлым — каля 300 кіламетраў. За пяць месяцаў трэніровак дзяўчаты пахудзелі хто на чатыры, а хто і на восем кілаграмаў!

Усяго ў маршы ўзяло ўдзел больш за 1200 чалавек і 46 адзінак тэхнікі. Сярод пешай калоны былі разлікі ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў і Акадэміі МУС, аўтамабільнай інспекцыі, дэпартамента аховы міністэрства і нават спецыялістаў-кінолагаў разам са службовымі сабакамі. Што датычыцца аўтамабільнай калоны, то спачатку праехаў разлік рэтратэхнікі — аўтамабілі мінулага стагоддзя, а затым і сучасныя машыны.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Сям'я — сем «Я»

# ПРАФЕСІЯ — БЫЦЬ МАЦІ

**Ордэн Маці атрымалі 22 жанчыны Мінскай вобласці напярэдадні свята 8 Сакавіка. Гэтую ганаровую ўзнагароду ўручыў шматдзетным маці падчас урачыстага прыёму старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА. Яшчэ 10 прадстаўніц цэнтральнага рэгіёна атрымаюць ордэн на рэспубліканскім мерапрыемстве. Кіраўнік сталічнай вобласці павіншаваў жанчын з высокай узнагародай і пажадаў, каб дзеці прыносілі ім толькі станоўчыя эмоцыі:**

— Вы ствараеце ўтульнасць і камфорт у сваіх сем'ях. Клімат, які пануе ў вашых дамах, уплывае на фарміраванне ўзроўню культуры грамадства ў цэлым. Калі дзеці растуць у атмасферы дабрыні, яны становяцца інтэлігентнымі і выхаванымі, а потым ствараюць такое ж грамадства.

Сямён Шапіра ўпэўнены, што выхаванцы шматдзетных маці, якіх сёння ўзнагародзілі, будуць жыць годна, як і іх бацькі, а Беларусь, дзякуючы ім, стане яшчэ больш камфортнай краінай для жыцця.

Па традыцыі ў цырымоніі ўдзельнічалі і спадарожнікі ўзнагароджаных жанчын. Павел і Ганна Харланчук-Южаковы ад імя прысутных падзякавалі ўладзе за ўвагу, падтрымку шматдзетных сем'яў і ўручылі губернатару памятны падарунак. Яны гадуюць пяцярых дзяцей. У таленавітай акцёрскай сям'і заўсёды пануюць творчасць, гармонія і пазітыў. Для Ганны Аляксееўны сям'я — гэта агульнасць інтарэсаў, працяг роду, традыцый і галоўны сэнс жыцця. А быць шматдзетнай маці — дар лёсу і вялікае шчасце. Харланчук-Южаковы, прызёры рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года — 2014», вядуць актыўную дзейнасць па папулярызацыі сямейных каштоўнасцяў: ладзяць спектаклі сямейнага тэатра.

У Марыны і Вячаслава Вішнеўскіх з Валожынскага раёна шасцёра дзяцей. Марына Паўлаўна знаходзіцца ў водпуску па доглядзе немаўляці да трох гадоў, яе муж Вячаслаў — індывідуальны прадпрымальнік.

Яўгенія Мартынава з Лагойскага раёна — маці пяці дачок і сына Багдана. Муж Сяргей Мікалаевіч працуе вадзіцелем у аўтапарку. Яўгенія Анатолеўна сапраўдная рукадзельніца: цудоўна вяжа, вышывае, гатуе фірменныя кулінарныя шэдэўры. Бацькі шмат часу аддаюць культурнаму і духоўнаму развіццю дзяцей, ладзяць сямейныя чытанні і турніры па інтэлектуальных гульнях.

Валянціна і Андрэй Далжэцкія з Мінскага раёна выхоўваюць сем непаўналетніх. Валянціна — кантралёр-касір на 1-й Мінскай птушкафабрыцы. Але цяпер у водпуску па доглядзе за двума малымі ва ўзросце да трох гадоў. Андрэй Аляксандравіч — мантажнік у будаўнічым трэсце. Валянціна Іосіфаўна лічыць, што быць маці семярых малых — гэта прафесія, якой вучышся ўсё жыццё. У яе свой, універсальны, рэцэпт шчасця — утульны дом, дружная сям'я і смех дзяцей.

У гонар свята шматдзетным маці ўручаны падарункі ад аблвыканкама, мінскіх абласных аддзяленняў Беларускага дзіцячага фонду і Беларускага фонду міру. Узнагароджаным жанчынам па месцы жыхарства належыць аднаразовая выплата ў памеры бюджэту пражытковага мінімуму — больш як 900 рублёў.

Усяго ж у Мінскай вобласці пражывае 14 755 шматдзетных сем'яў, якія выхоўваюць 47 999 непаўналетніх. Сёлета ім выплачана па лініі сацыяльнай абароны 50,2 млн рублёў. Летась 1522 шматдзетныя сям'і атрымалі льготныя крэдыты на будаўніцтва, рэканструкцыю і пакупку жылых памяшканняў — 24 057,72 тыс. рублёў. Фінансавая дапамога дзяржавы для пагашэння запазычанасці па крэдытах выдзелена 9242 шматдзетным сем'ям у памеры 6156,07 тыс. рублёў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# Пра нашы правы

## У Палаце прадстаўнікоў госці з бундэстага абмеркавалі Нацыянальны план па правах чалавека

**Упаўнаважаны федэральнага ўрада Германіі па палітыцы ў галіне правоў чалавека і гуманітарнай дапамогі, дэпутат бундэстага Бербель КОФЛЕР станоўча ацаніла з'яўленне гэтага дакумента. Яна прапанавала працягнуць дыялог па яго рэалізацыі паміж калегамі з парламентаў абедзвюх краін.**

**Андрэй НАВУМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі,** які таксама ўзначальвае рабочую групу па вывучэнні праблематыкі смяротнага пакарання ў Нацыянальным сходзе Беларусі, адзначыў, што гэта пытанне вельмі адчувальнае для нашай краіны. «Сёння мы занялі пазіцыю шырокага абмеркавання ў грамадзянскай супольнасці». Рабочая група сур'ёзна працуе з рэгіёнамі. І не выключаны варыянт разгляду гэтага пытання ў наступным годзе ў Палаце прадстаўнікоў. Таксама магчыма правядзенне ў Беларусі міжнароднай канферэнцыі з удзелам еўрапейскіх экспертаў па праблематыцы смяротнага пакарання.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Паўночная Карэя запусціла залпам чатыры балістычныя ракеты



Паўночная Карэя запусціла адразу чатыры балістычныя ракеты ў бок Японскага мора, заявіў прэм'ер-міністр Японіі Сіндза Абэ. Паводле яго слоў, тры з іх праляцелі каля тысячы кіламетраў, перш чым упасці ў моры ў эксклюзіўнай эканамічнай зоне Японіі. Міністэрства абароны Паўднёвай Карэі, у сваю чаргу, заявіла, што ўсе ракеты былі запушчаны з палігона ў правінцыі Тончхан непадалёк ад кітайскай мяжы і ўпалі ў моры.

### «Ісламская дзяржава» пагражае Кітаю «рэкамі крыві»

Групоўка «Ісламская дзяржава Ірака і Леванта» (ІД) упершыню ў сваёй гісторыі выступіла супраць Кітая. У ролiку, змантаваным экстрэмістамі, партрэт старшыні КНР Сі Цзіньпіна ператвараецца ў струмень полымя, а Паднябесная пагражаюць праліццём «рэк крыві». ІД выступае ў падтрымку ўйгурскіх сепаратыстаў, якія ў складзе ад 100 да 300 чалавек адправіліся на вайну ў Ірак і Сірыю.

### Рауль Кастра раскрытыкаваў планы Трампа па ўзвядзенні сцяны на мяжы з Мексікай

Старшыня Дзяржсавета і Савета Міністраў Кубы Рауль Кастра раскрытыкаваў планы прэзідэнта ЗША Дональда Трампа па будаўніцтве сцяны на мяжы з Мексікай. Аб гэтым ён заявіў на саміце Баліварыянскага альянсу для народаў Амерыкі, які адкрыўся ў Каракасе, дадаўшы, што Куба выказвае ў гэтым пытанні салідарнасць з мексіканскім народам. На думку Кастра, «мігрантаў можна спыніць не з дапамогай сцен, а з дапамогай супрацоўніцтва, узаемаразумення і міру».

### Навукоўцы сведчаць, што ступень сацыяльнай ізаляцыі моладзі дасягае ўзроўню эпідэміі



Навукоўцы пацвердзілі, што людзі, якія актыўна кантактуюць у сацыяльных сетках, адчуваюць сябе сацыяльна ізаляванымі ў рэальным свеце. «Гэта вельмі важная праблема, бо ступень сацыяльнай ізаляцыі моладзі дасягае ўзроўню эпідэміі. Сацыяльныя сеткі могуць здацца панацэяй ад гэтай праблемы, аднак наша даследаванне паказвае, што гэта не так», — заявіў Брайан Праймэк з універсітэта Пітсбурга (ЗША). У апошнія гады ў некаторых краінах набывае ўсё большую папулярнасць ідэя «фэйсбук-залежнасці» — нястрымнай цягі да зносін у сацыяльных сетках за кошт астатніх аспектаў жыцця.

■ Заўтра свята!

# АД ПАТЭЛЬНІ ДА ЛЕДЗЯНЦА

## Што дараць жанчынам беларусы?

**Восьмага сакавіка — прыемная дата для большасці жанчын, для многіх жа прадстаўнікоў дужай палавы — прычына галаўнога болю. Карэспандэнт «Звязды» выбраўся ў «рэйд» у сталічны ГУМ, каб паназіраць, якім прэзентам аддаюць перавагу мужчыны, а таксама распытаў саміх «віноўніц урачыстасці» пра найлепшыя і найгоршыя падарункі ў іх жыцці.**

Пэўна, адна з самых папулярных секцый — посуду і гаспадарчых тавараў. Мужчыны выбіраюць сервізы, наборы фарфоравых талерак, кубкі — «практычныя» і заўсёды карысныя рэчы.

— Я шукаю падарунак для цешчы, — расказвае **пакупнік Алег ІВАШКЕВІЧ**. — Яна ўжо на пенсіі і займаецца пераважна гатаваннем. Пакуль прыглядаюся да набору для выпякання. Што датычыцца жонкі, то мы з ёй штогод адзначаем жаночы дзень аднолькава — ходзім вячэраць у кавярню, так будзе і сёлета.

— Вядома, напярэдадні свята ў нас адчуваецца наплыў пакупнікоў-мужчын, — кажа **загадчык секцыі гаспадарчых тавараў і посуду Людміла СЦЯЦКО**. — Вылучыць самыя папулярныя тавары цяжка. Школьнікі, напрыклад, аддаюць перавагу кубачкам з надпісамі ці прыгожымі малюнкамі, людзі сталага веку — падарункавым наборам посуду. Нехта спыняецца на вазах, келіхах ці статуэтках. Ёсць і тыя, хто набывае не вельмі «святочныя» рэчы: патэльні, каструлі. Адзін з самых дарагіх чэкаў за апошнія дні — на 250 рублёў, мужчына набыў шыкоўны набор посуду.

Яшчэ адзін аддзел, каля якога чэргі не знікаюць, — ювелірны. **Сяргей ЛАЗАРАЎ** прыйшоў сюды, каб набыць сяброўцы завушніцы. Паводле слоў мужчыны, упрыгажэнне — заўсёды найлепшы падарунак, бо ён будзе бясконца нагадваць гаспадыні пра дарыльшчыка. Для тых, хто так і не здолеў вызначыцца са святочным сюрпрызам, найлепшым варыянтам, магчыма, стануць падарункавыя сертыфікаты, якія можна набыць практычна ў любым універмагу.

На выхадзе трапляем у кветкавыя кіёскі. Цэны на цюльпаны ў большасці прадаўцоў аднолькавыя — два рублі за штуку. Акрамя таго, некаторыя прапаноўваюць гатовыя букеты з пяці кветак за сем рублёў. Заўсёды ў трэндзе і кветкі ў вазонах — яны дакладна будуць радаваць сваю гаспадыню даўжэй за самыя жывучыя цюльпаны. Так, напрыклад, за архідэю просяць 15 рублёў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

### Якія падарункі не падабаецца атрымліваць?

**Ульяна, перакладчык:**

— З году ў год мне дораць адно і тое ж: кветкі і сертыфікаты ў краму жаночай бялізны. Гэта неймаверна раздражнее. Праўда, яшчэ горш выйшла, калі ў нашай кампаніі паспрабавалі зрабіць нешта незвычайнае, і замест кветак падарылі жанчынам набор пад назвай «Вырасці сабе цюльпан сам». У тэорыі задумка неблагая, але праблема ў тым, што ні ў кога нічога не ўзышло. Ужо не ведаю, у чым там была праблема, але «падарункам» аказаўся змарнаваны час.

**Анастасія, гукарэжысёр:**

— Для мяне непрымальна ўсё банальнае, універсальнае і пустое. Напрыклад, букеты з шарыкаў, мяккія цацкі, любыя статуэткі, скарбонкі, касметыка (таму што калі гэта не гель для душа, то ніколі не ўгадаеш), кубкі, тапкі... Не нашмат лепш што-небудзь для кухні: яйкарэзкі, патэльні ці фартухі. Яшчэ многія дораць бессэнсоўныя хэнд-мэйдрэчы кшталту рознакаляровага пяску слаямі ў слоіку. Цярпець не магу кнігі накшталт «Штодзённіка жанчыны». А аднойчы мне падарылі двухкілаграмовы ледзянец — такую велізарную і бескарысную лухту на палачцы.

**Ганна, спецыяліст па маркетынгу:**

— Як па мне, дык самыя горшыя падарункі на любое свята — кветкі і ўпрыгажэнні. Першыя — таму што яны мне не падабаюцца. А вось з ювелірнымі вырабамі праблема ў тым, што гэта вельмі індывідуальная справа, не кожны мужчына ўмее іх выбіраць. А гэта ж потым трэба насіць, нават калі яно табе не пасуе! Выдатны падарунак — гэта нешта ўнікальнае і запамінальнае. Паехаць аўтастопам — вось мой варыянт найлепшага сюрпрызу.

### Які падарунак на 8 Сакавіка найбольш запомніўся?

**Дар'я, менеджар па рэкламе:**

— Асабіста мяне ўразіць падарункам нескладана — варта толькі ведаць, чым я цікаўлюся. Летась хлопец падарыў мне букет белых цюльпанаў і вялікі і цяжкі пакет. Калі я яго адкрыла, захапленне цяжка было перадаць словамі! Справа ў тым, што я даўно займаюся спортам, а ў пакеце ляжала некалькі кілаграмаў пратэінавых батончыкаў і іншае спартыўнае харчаванне. Гэта называецца «трапіў дакладна» — падарунак на догі час пазбавіў мяне надакучлівых паходаў у спецыялізаваныя крамы. Вось і ўвесь сакрэт.

**Вераніка, спецыяліст па камунікацыях:**

— Мне шмат усяго дарылі на 8 Сакавіка: духі, цюльпаны, цукеркі, грошы. Але найбольш запомнілася іншае. З ранку мяне на падносе чакалі смачныя цёплыя бліны, якія мой хлопец проста выдатна гатуе, кубачак кавы і вясновыя кветкі. Астатні час дня мы правялі дома за праглядам нашых любімых фільмаў. Мне імпануе, калі сюрпрыз зроблены з улікам таго, што ты сапраўды любіш. Тады зразумела, што малады чалавек заўважае дробязі ў вашых стасунках. І падарунак зроблены не таму, што «сёння 8 Сакавіка, а гэта значыць, трэба нешта купіць сваёй дзяўчыне».

**Паліна, арганізатар канцэртаў:**

— Я люблю нечаканыя падарункі. Сертыфікаты, пра якія забываеш і тэрмін дзеяння якіх выходзіць за тры месяцы; нейкія матэрыяльныя дробязі — гэта ўсё не для мяне. Летась у офісе мужчыны зрабілі нам абсалютна «не жаночы» сюрпрыз — гульню ў лазертаг. Гэта было незабыўна! Я, можа б, і цяпер такі падарунак хацела, але ведаючы, як будуць балець цягліцы...

# ЗА ШТО МЫ КАЖАМ ІМ «ДЗЯКУЙ!»

**У жыцці кожнага з нас ёсць жанчына (ці нават не адна), якой напярэдадні свята хочацца сказаць асаблівыя словы. «Каму з жанчын і за што вы хацелі б падзякаваць?» — з такім пытаннем «Звязда» звярнулася да прадстаўнікоў розных прафесій.**

**Люцыя ГЕРАШЧАНКА, тэлевядучая:**



— Хачу падзякаваць сваёй свекрыві за яе падтрымку і жыццёвую мудрасць. І сказаць, што мала каму так шанцуе са свякроўю, як мне. Хачу падзякаваць сваёй бабулі, якая аддала мне столькі свайго часу і сваёй любові. Я адчуваю, што цяпер недадаю ёй увагі, але яна ставіцца да гэтага з разуменнем. І я ніколі не чую ад бабулі ні слова дакору. Хачу падзякаваць сваёй выкладчыцы на факультэце журналістыкі Людміле Саянковай. Яна нават не ведае, як многа мне дала, навучыўшы разбірацца ў мастацтве, — не праз адчуванне, а праз разуменне. І, вядома, хачу падзякаваць маме! Толькі стаўшы дарослай, ты разумееш, наколькі гэта цяжка — быць маці, якая аддае табе кожную хвіліну свайго жыцця. І мы з сястрой гэта бачым і цэнім. Дзякуй табе, матуля!

**Лідзія ЛЕШЧАНКА, настаўніца:**



— Па-першае, хачу падзякаваць за ўсё маёй маме Святлане Леанідаўне. Па-другое, сваім педагогам: Ірыне Васілеўне, Наталлі Васілеўне, Таццяне Мікалаеўне... Гэта імёны настаўніц. Не, не толькі школьных, а проста НАСТАЎНІЦ па жыцці. Яны натхнялі сваім прыкладам і адданасцю справе, яны давалі «маральныя аплявухі», калі гэта было неабходна, але не пераставалі верыць у мяне. А колькі яшчэ цудоўных жанчын было ў маім жыцці! І амаль усе яны працавалі ў сістэме адукацыі — выхавацелькі, рэпетытары, кіраўніцы гурткоў, важатыя, педагогі ў музычных школах, выкладчыцы ва ўніверы, калегі... Дзясяткі выдатных жанчын, якія падштурхнулі да здзяйснення мар. Шчыры вам дзякуй! Хай гэтая вясна разам з талай вадой змые ўсе нягоды з вашага жыцця, хай вашы выхаванцы дораць вам толькі радасць і натхненне, хай сонца ніколі не сыходзіць з вашых вачэй. Са святам вясны вас, даражэнькія!

**Віктар ЛУПАСІН, літаратар і музыкант:**



— Каму з жанчын я хацеў бы падзякаваць? Нагул, такіх жанчын вельмі шмат. Зразумела, гэта мама, бабуля, іншыя сваячкі, частка настаўніц (у нас была вельмі добрая школа). Паэткі Людміла Рублеўская, Наталля Кучмель і Дзіяна Капусцян, якія прывялі мяне ў літаратуру. Далей пачынаецца вялікі роздум, каму менавіта падзякаваць. Няхай гэта будуць Ганна Данілюк, якая летась выдатна ўзяла мяне з «абломаўшчыны», і дзяўчына Віка, якая дапамагае ладзіць канцэрты. Са святам!

**Павел КАВАЛЁЎ, відэааператар:**

— Хачу падзякаваць касіркам у гіпермаркеце каля майго дома — за тое, што яны на працягу ўсяго працоўнага дня знаходзяць сілы, каб усміхацца, дзякаваць за пакупку, цярпець марудлівых пакупнікоў, якія вельмі доўга разлічваюцца... Дзякуй вам вялікі за гэта! Заўсёды прыемна бачыць вашы ўсмешкі!

**Аляксей АДАРАНКА, байкер:**



— Так склалася, што з пяці гадоў я рос без маці. Таму маім выхаваннем займаліся бабулі — Ірына Яфрэмаўна і Марыя Майсеёўна. На жаль, яны даўно ўжо пайшлі ад нас... Але адна паспела навучыць мяне жыццёвай мудрасці, другая — адкрыць мне свет мастацтва і, у прыватнасці, музыкі. Дзякуй ім вялікі за гэта!

**Пабачыць, каму і за што ўдзячны супрацоўнікі «Звязды», можна на нашым сайце zviazda.by**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# Кожны свежы нумар бяру з асалодай

**Аляксандр ВЯРСОЦКІ, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама:**



— Можа, гэта такі эмацыянальны момант, але я пра яго хачу сказаць. Быў 2000 год, толькі паўгода, як прыйшоў з войска. І вось летам еху на ровары каля сядзібы Міхала Клеафаса Агінскага, вёз у мяшку траву для трусоў (бацькі мае трусоў трымалі). Вось еду, а насустрач ідзе чалавек з вялікім фотаапаратам і пытае: вы не супраць, калі я зраблю ваш здымак? Сказаў, што ён будзе размешчаны ў газеце «Звязда». Пазнаёміліся. Гэта быў фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук. І вось у хуткім часе на першай старонцы газеты з'явілася маё фота, а пад ім подпіс: «Аляксандр Вярсоцкі працуе настаўнікам у сярэдняй школе №6 Смаргоні, і падчас летніх канікул дапамагае бацькам па гаспадарцы».

Праз некалькі месяцаў я прыйшоў у школу і стаў заўважаць, што многія мае вучні выразалі гэты здымак і трымалі яго пад вокладкай падручнікаў, тады былі празрыстыя вокладкі. Відаць, у іх сем'ях таксама чыталі «Звязду». Выпісваў яе і мой дзядзька. З-за таго, што выдаецца на беларускай мове. З тых часоў «Звязда» стала і маёй газетай, і кожны свежы нумар я бяру ў рукі з асалодай. Я выбіраю «Звязду», каб праз вашу газету не толькі даведацца, але і паведаміць нешта новае, асаблівае, а таксама запрасіць чытачоў газеты ў наш гродзенскі край.

Сёлета мы ладзім вельмі многа цікавых свят. Гэта будуць брэнды нашых гарадоў і вёсак. Думаю, чытачы «Звязды» даведаюцца пра гэтыя святы са старонак газеты і захочуць уключыць іх у свае турыстычныя маршруты. Бо і музычныя калектывы, і народныя майстры, і пачастункі, і традыцыі ў кожным населеным пункце адметныя, не падобныя на іншых. Так, брэндам Шчучынскага раёна будзе свята «Добры дзень, суседзі». Жыхары адной вёскі прыязджаюць у суседнюю са сваімі культурнымі здабыткамі, потым самі прымаюць гасцей. Зэльва, напрыклад, славіцца конскім кірмашом, таму тут пройдзе фестываль коней. У Воранаве — свята прыпеўкі, у Слоніме — Паўлаўскі каравай, у Смаргоні — свята абаранкаў, у Дзятлаве — фестываль росных лялек. Будзе добра, калі заедуць на іх беларускія, а можа, і замежныя турысты. Думаю, што чытачы «Звязды» ведаюць пра наш папулярны брэнд — Аўгустоўскі канал. У гэтым годзе ўпершыню ладзім тут новы фестываль рок-музыкі «За здаровы лад жыцця». Спадзяюся, што ён стане традыцыйным і яго наведаюць чытачы «Звязды».

**Запісала Маргарыта УШКЕВІЧ.**

■ Надвор'е

# САМЫ ЦЁПЛЫ ДЗЕНЬ ТЫДНЯ

## Менавіта 8 сакавіка сіноптыкі прагназуюць самую высокую тэмпературу на тыдні — да плюс 14 градусаў

**У наступныя 5—6 дзён на тэрыторыі краіны будуць гаспадарыць атмасферныя франты, якія змяшчаюцца з паўднёвых і паўднёва-заходніх раёнаў Еўропы. Чакаецца няўстойлівае з ападкамі надвор'е, а тэмпературны фон застанецца значна вышэйшы за кліматычную норму, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Сёння ў большасці раёнаў краіны пройдуць дажджы, па паўночным захадзе — дажджы з мокрым снегам. Тэмпература паветра ўдзень складзе ад плюс 2 да плюс 8 градусаў, а па поўдні краіны чакаецца да 9—11 цяпла.

Захаваецца ўплыў атмасферных франтоў і ў сераду на свята 8 Сакавіка. Прагназуецца, што ўначы ў крайніх паўночна-ўсходніх і паўднёва-заходніх раёнах, а ўдзень пераважна па заходняй частцы Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаюцца слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў. Удзень прагназуецца 4—11 цяпла, а па паўднёвым усходзе — да плюс 14 градусаў. У чацвер характар надвор'я істотна не зменіцца, але стане крыху халадней. У заходніх і цэнтральных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У паўночна-заходніх раёнах Беларусі чакаецца мокры снег, уначы прагназуецца слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў. Удзень прагназуецца ад плюс 6 да плюс 12 градусаў, а па паўночным захадзе — 3—5 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў сіноптыкаў спецыялістаў, у пятніцу, суботу і нядзелю захаваецца няўстойлівае надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да 5 градусаў цяпла, а ўдзень — плюс 3—10 градусаў, па поўдні — да 12 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Персона

# А вы чулі, як дыхае зямля?

**У шафе ў кабінеце старшыні Добрушскага райвыканкама Вольгі МОХАРАВАЙ не толькі прыгожыя сукенкі, але і боты гумавыя і куртка рабочая. Сустракае з прычоскай і макіяжам, аднак у світары і душагрэйцы — ужо гатовая ажыццявіць чарговы аб'езд сваіх уладанняў. У першай палове дня — ферма, у другой — віншаванне найлепшых жанчын раёна.**



— Калі мне 12 гадоў назад тагачасны губернатар Аляксандр Якабсон прапанаваў узначаліць раён, я нават не думала, згадзілася адразу. Я не разумею мужыкоў, якім прапануюць пасаду кіраўніка гаспадаркі, а яны кажуць: можна, я падумаю тыдзень. А што тыдзень думаць? Я ж да гэтага працавала першым намеснікам па сельскай гаспадарцы ў Гомельскім раёне. А ўвогуле пачынала пасля тэхнікума ў сябе на радзіме, у Брагінскім раёне. Там канфлікт здарыўся са сваячкамі і суседкамі. Яны хацелі, каб я ім тлустасць малака ставіла вышэй за наяўную. Ну не магла я гэта рабіць! Яны ж ваду лілі ў малако. Дамоў прыходжу, а бацькі мне і кажуць: ведаеш што, дзеўка, збірай манаткі, прасіся ў іншую гаспадарку. Бо пасварыш нас у вёсцы з усімі.

Усё жыццё дарогу я прабівала сама. У мяне не было «валасатай рукі». Бацька трактарыст. Маці ў паляводчай брыгадзе. Якой я павінна была вырасці? Я ў баях з хлопцамі заўсёды перамагала. Мяне абараніць не было каму. Я ж самая старэйшая ў сям'і і таму сама ўсіх абараняла. Дарэчы, як і цяпер. Калі да мяне на прыём прыходзіць даярка з рукамі ў мазалях, я ўспамінаю рукі сваёй маці — яны такімі ж былі. Памятаю, як ірвалі лён — я з маці на поле хадзіла. Я магу сноп добры звязаць і цяпер. Калі на ферму прыязджаю на дойку, бачу па вымені, што малако засталося, кажу даярцы — дай мне кубачак. Хоць пальцамі, хоць кулаком падаю. А там жа самае тлустае малако застаецца! Дзякуй богу, што я вырасла ў вёсцы і ўмею ўсё сама. У нас усе дзеці былі прывучаны да працы і потым маці дапамагалі і дзвюх кароў даглядаць, і свінаматак з парасятамі.

***— Няўжо ні лётчыцай, ні актрысай ніколі не хацелі стаць?***

—Нават і ў марах не было. У 15 гадоў пасля васьмі класаў паехала ў Красны Бераг паступаць на агранома, але пераначавала, расплакалася, села ў поезд і вярнулася дадому — нават не стала здаваць экзамены. А пасля 10 класаў бацька мяне завёз у Рэчыцкі зоаветэрынарны тэхнікум. Там я грызла навуку — у школе так не вучылася, як у тэхнікуме. Пры гэтым больш любіла гуманітарныя прадметы, чым тэхнічныя. І, канешне, мне па паводзінах ледзь не ўляпілі тройку. Я была лідар заўсёды. Калі зараз чую, што маці дзецям нешта не даюць рабіць, кажу: не забівайце ў дзіцяці асобу! Калі яму ўсё забараняць — яно слова будзе баяцца сказаць. Навошта вам, каб дзеці сядзелі і ў рот глядзелі? Асоба павінна мець характар.

***— Вы, атрымліваецца, за ўсіх членаў сваёй сям'і ўзялі клопат...***

— Нас трое ў бацькоў. Сястра і брат так і засталіся жыць у Брагінскім раёне. Сястра закончыла інстытут і на адным рабочым месцы прапрацавала да пенсіі настаўніцай. Яна таксама жорсткая і патрабавальная. Ёсць гэта ў нас. Ад мамы, бо бацька ніколі за жыццё не крыкнуў ні на кога. А маці, якая засталася сіратою з шасці гадоў, баявая была. Яна ўсё жыццё нам казала: апошні кусок хлеба аддам, каб толькі вы атрымалі адукацыю. Каб вы так не гаравалі, як я гаравала. Усе мае пляменнікі хто атрымаў, а хто атрымлівае вышэйшую адукацыю. Я ім дапамагаю вызначыцца ў жыцці. Сын Уладзіслаў па адукацыі юрыст, а працуе ў мясцовым доме культуры. Я яму давяраю. Сын спакойна можа знівеліраваць любы канфлікт, і я з ім раюся па многіх пытаннях. Дзяцей адпускаць трэба. Шкадаваць, але адпускаць і няхай цялёпкаюцца, але выплываюць самі.

**Пра тое, каму і як дапамагае старшыня Добрушскага райвыканкама Мохарава, у раёне расказваюць легенды. Сабак, якіх кідаюць дачнікі, яна прыстройвае памочнікамі да вартаўнікоў у мясцовыя гаспадаркі. Цяжарных адзінокіх дзяўчат уладкоўвае на работу — каб лёс свой паспрабавалі змяніць. Тым, хто вярнуўся з турмы, са сваёй кішэні аплачвае аднаўленне дакументаў. Ёсць у яе «свой» дзіцячы дом, куды возіць падарункі на святы... Дарэчы, яна ганаравана двума праваслаўнымі ордэнамі і двума медалямі.**

Мне людзі адкрываюць сваю душу. Можа, таму, што не казённа я прыёмы вяду? Людзі ж ідуць з надзеяй. Я ж для іх — улада. А ўлада для таго і створана, каб дапамагаць людзям. І яны ўдзячныя — прыносяць мне кветкі са свайго агарода. Не ўсе, канешне. Ёсць і такія, што жывуць выключна скаргамі і нават кідаюцца і лаюцца. Пасля аднаго такога выпадку ў мяне з'явілася трывожная кнопка. Не заўжды чалавеку можна аказаць матэрыяльную дапамогу згодна з законам. Калі бачу, што сапраўды патрэбна, усё, што магу, — гэта са свайго кашалька даць на хлеб з каўбасой. Калі пачуцця спачування не будзе — не ведаю, у што свет ператворыцца. Я вельмі не люблю прасіць. Лепш — аддаваць. З узростам гэта важней і важней становіцца.

***— Кожны чалавек па-свойму прыходзіць да веры. У які момант вы сталі бліжэй да Бога?***

— Мы раслі ў час атэізму, і маці мая не хадзіла ў царкву, хоць іконы ў доме віселі. Адну з іх я забрала, калі дом апусцеў. Мяне да веры прывёў ігумен Аўксенцій, сёння настаяцель Юравіцкага манастыра. Гадоў 15 таму ён прыйшоў прасіць выпісаць бульбу для Нікольскага манастыра і запрасіў прыйсці на службу. Схадзіла і адчула, як мне добра там. Мне неяк лягчэй жыць на свеце стала. З верай лягчэй працуецца. У нас восем прыходаў, якім мы дапамагаем і ахвяруем многа. Толькі за час, пакуль я старшыня райвыканкама, мы шэсць цэркваў адкрылі. Цяпер будзе царква вялікая будавацца каля трасы на Расію. У вёсцы Чырвоны Партызан ёсць царква, пабудаваная без адзінага цвіка. Але там людзей амаль не засталося. Тым не менш знайшлі мы спонсара і аднаўляем яе штогод.

***— Вольга Фёдараўна, Добрушскі край яшчэ ж і адзін з цэнтраў праваслаўя на Гомельшчыне.***

— У вёсцы Карма захоўваюцца мошчы святога Іаана Кармянскага і сюды прыязджае шмат паломнікаў. Нас гэта да многага абавязвае. Для мяне важна, каб усе бачылі, што тут усё па-гаспадарску. Сёлета спаўняецца 100 гадоў з дня смерці Іаана Кармянскага, і мы пачынаем рыхтавацца да важнага свята, якое адзначым у канцы мая.

**Некалькі разоў невялікі Добруш перасякаюць дзве рэчкі. Іпуць і Харапуць робяць горад падобным на Венецыю. 14 мастоў за апошні час прыведзены да ладу. І гэта — асаблівы гонар Вольгі Мохаравай за час, пакуль яна кіруе раёнам. Гавораць — яшчэ б дарогі заасфальтаваць...**

У нас фарфоравы завод поўнасцю прайшоў мадэрнізацыю. З ліпеня пачне працаваць аднаўленая за кошт кітайскага крэдыту папяровая фабрыка, што відавочна надасць гораду другое дыханне і 300 рабочых месцаў. На горна-ўзбагачальным камбінаце цяпер пясок здабываюць круглы год. У нас два хлебазаводы і абодва мадэрнізаваныя.

***— Ведаю, што і цяпер вы асабліва ставіцеся да сельскай гаспадаркі...***

— Мы двойчы атрымлівалі па 100 тысяч тон збожжа. І сёлета плануем, што ў нас атрымаецца. У нас сярэдні заробак па раёне ўжо перавышае 500 рублёў. Ведаеце, для мяне асноўнае, што ў раёне атрымалася захаваць касцяк кіраўнікоў. Многія працуюць са мной усе 12 гадоў. Гэта галоўнае — у нас ёсць каманда.



**На юнацкіх фотаздымках Вольга СНІЦАРЭНКА (дзявочае прозвішча Мохаравай) — чорнавалосая прыгажуня са строгім позіркам. Яна нарадзілася ў вёсцы Чамярысы ў сям'і калгаснікаў, і спадзявацца на дапамогу аднекуль ёй не прыходзілася ніколі.**

***— Што вас можа вывесці з сябе?***

— Калі раней заходзіла на ферму і бачыла галодную жывёлу. Як можна кіраўніку класціся спаць і ведаць, што жывёла галодная стаіць? Цяпер у мяне вышэйшай укормленасці з зімоўкі жывёла выходзіць. Калі ў спякоту прыязджаю на пашу і бачу, што п'яныя пастухі ляжаць ці ў «дурня» гуляюць, а жывёла зямлю грызе і раве... Вывесці з сябе мяне можа абыякавасць да сваёй справы. Мяне выводзяць несумленнасць і п'янства. Да таго ж калі п'яная даярка падаіла карову збольшага, тое, што засталося ў вымені, — выклікае запаленчы працэс, які прыводзіць да хваробы. І карову, якую мы тры гады гадавалі, вязём на мясакамбінат. Ведаеце, якія страты наносіцца гаспадарцы і дзяржаве ўвогуле?

***— Якія якасці цэніце ў людзях?***

— Мне падабаецца выраз: мужык сказаў — мужык зрабіў. А калі мужык сказаў і не зрабіў — я з ім працаваць не буду. Яшчэ я зразумела, калі прыйшла сюды, што караля сапраўды робіць світа. У мяне ёсць «чуйка» на кадры. І са мной сёння людзі, якімі я вельмі даражу. Калісьці мой старэйшы калега аграном Хімянкоў спытаў мяне: а ты чула, як дыхае зямля? Ён мне так растлумачваў, што такое ў справаздачнасці «закрыццё вільгаці». Кажа: паехалі ў поле. Я на калені станавілася і прыкладала вуха да зямлі. Сапраўды, зямля дыхае і поры ў зямлі адкрываюцца. Каб адчуць, калі сеяць, ён мне раіў: выстаў руку і вазьмі зямлю «ў локаць». І калі рука ад зямлі не замерзне — пачынайце сеяць. Так і ў жыцці — усяму патрэбны цяпло, ласка і клопат. І тэхналогія, канешне. Чалавек не можа ўсё ведаць. Таму мне не сорамна распытваць. Канешне, я эмацыянальная. А калі кіраўнік не будзе эмацыянальным, нічога ў яго не атрымаецца.

**Напярэдадні свята — некалькі пытанняў пра справы жаноцкія**

***— А што вы гатуеце дома? Ёсць любімая страва для ўсёй сям'і?***

— Ёсць. Дранікі і ўкраінскі боршч з часнаком і грыбамі. Мужыкі ў мяне любяць мяса — таму абавязкова і з мясам. Бліны вельмі смачна гатую. А вось цеста мяне не любіць. Ні булак, ні пірагоў пячы не магу. Гэта не маё. Шкада, часу мала гатаваць. Калі гатую — думаю, што заўтра апрану, куды паеду, з кім што запланавана зрабіць...

***— Якія кветкі — вашы любімыя?***

— Мне здаецца, усе кветкі люблю. І архідэі, і цюльпаны першыя. Яшчэ вельмі люблю туі. Іх у мяне на дачы 42 — самых розныя. У мяне там блакітныя ядлоўцы, канадскія елкі, чатыры рададэндраны, вялізныя кусты гартэнзій і ружы. Я прыходжу туды, і мне так лёгка дыхаецца.

***— Што трэба рабіць, каб не стаміцца жыць?***

— Любіць. Людзей, жывёл, сваю працу... Без любові нічога не атрымаецца. Нават боршч без любові не зварыш. Ты павінна хацець раніцай устаць, зрабіць прычоску, прывесці сябе ў парадак і выпырхнуць на працу. Так, як быццам крылы за спінай. І таксама дадому вечарам хацець прыйсці, нешта прыгатаваць, пасядзець, пагутарыць са сваякамі. Жаданне жыць павінна быць у кожнага. Калі яго няма — гэта страшна.

***— Калі б вы не сталі кіраўніком, кім бы маглі сябе ўявіць?***

— Нават не ведаю. Напэўна, усё роўна была б спецыялістам у сельскай гаспадарцы. Я не ўяўляю сабе жыцця, якое не звязана з вёскай. Хіба, можа, урачом? Медыцына ж павабная. Калі б стала ўрачом — дык хірургам. Я заўсёды там, дзе трэба воля, адказнасць і рашучасць. Толькі так. І ўсё ж, калі мне дрэнна на душы — саджуся за руль і еду ў раён. Там людзі, якія не здрадзяць, не абразяць, не пакрыўдзяць... Калі дрэнна — яны разам з табою. У мяне другое дыханне адкрываецца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*



**Свята «Казюкі» ўзнавілі каля 20 гадоў таму. А ў старадаўнія часы такія кірмашы праводзіліся 4 сакавіка паўсюдна на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Польшчы. Такім чынам майстры ўслаўлялі свайго абаронцу — Святога Казіміра, які жыў у XV стагоддзі і памёр у маладым узросце 4 сакавіка 1484 года. Праз два стагоддзі яго products кананізавалі і сталі ўслаўляць як абаронцу рамёстваў. «Казюкі» шырока адзначаюць у Літве і Польшчы.**

# НА «КАЗЮКІ» Ў ГРОДНА

## Традыцыйны кірмаш сабраў у горадзе над Нёманам каля 200 майстроў з Беларусі і Польшчы

Галоўным атрыбутам свята лічацца «казіміркі» — прыгожа аформленыя галінкі вярбы. У Гродне нямала майстрых, якія робяць такія букеты. Наведвальнікі кірмашу не абыходзілі іх, разглядалі, прыцэньваліся.

Як паведаміла **загадчыца цэнтра народнай творчасці «Спадчына» Святлана ПАЛЧАНКАВА**, на ўдзел у кірмашы было пададзена 150 заявак ад майстроў Беларусі. Але на самай справе прыехала больш. Свае драўляныя вырабы — бочкі, лыжкі, кошыкі — прадставіў нават майстар з Івана-Франкоўска.

**Старшыня Гродзенскага гарадскога аддзела Саюза палякаў на Беларусі Казімір ЗНАЙДЗІНСКІ**, адзін з арганізатараў свята, зазначыў, што ўпершыню сваю творчасць прадставілі польскія майстры з Беластоку, таксама на кірмашы выступілі музычныя калектывы з Польшчы.

Адметнай рысай сёлетняга фестывалю стаў абрад «Пасвячэнне ў майстры», калі вопытныя рамеснікі прымаюць маладых майстроў у сваю гільдыю. Залічваюць тых, каму старэйшы майстар драўлянай лыжкай стукнуў па руцэ. Такім чынам былі прыняты ў гільдыю двое гродзенцаў.

Фестываль з кожным годам пашыраецца. Калі напачатку майстрам хапала месца на невялікім кавалку вуліцы, то сёлета яны занялі амаль усю плошчу Савецкую, якая, дарэчы, некалі насіла назву Рыначнай. Трэба сказаць, што майстрам было чым здзівіць наведвальнікаў. Шкло, кераміка, саломка, гліна, дрэва — гэтыя матэрыялы сталі цудамі ў руках рамеснікаў. Праўда, і каштавалі такія рэчы не танна. Таму наведвальнікі кірмашу не спяшаліся раскрываць свае кашалькі. Большасць звярталі ўвагу на дробныя рэчы. Напрыклад, на гліняныя свістулькі. Дарэчы, без іх не абыходзіцца ні адзін кірмаш «Казюкі», бо, згодна з павер'ем, птушкі-свісткі здольны заклікаць вясну. Відаць, яна на падыходзе, бо на «Казюкі» з самага ранку усталявалася сонечнае надвор'е, якое спадарожнічала майстрам на працягу ўсяго кірмашу.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zvizda.by*

# ТАТА Ў «ДЗІЦЯЧЫМ» АДПАЧЫНКУ:

## за мяжой — модна і папулярна, у нас пакуль — рэвалюцыйна

**Мужчыны, якія больш займаюцца з дзецьмі, даўжэй жывуць, менш рызыкуюць і лепш харчуюцца. А тыя, хто быў у дэкрэце, становяцца больш карыснымі супрацоўнікамі, сведчаць спецыялісты, і раяць беларускім татам часцей браць водпуск па доглядзе малых. Такім чынам у краіне будзе зніжацца і рызыка непрымання на працу маладых жанчын.**

### ДЭКРЭТ СПРЫЯЕ ЗДАРОЎЮ І ПАВЫШАЕ ІМІДЖ КАМПАНІІ

Ідэя далучэння мужчын да выхавання і заняткаў з дзецьмі — не проста модны кірунак развіцця грамадства. Яе карысць пацвярджаецца вынікамі даследаванняў і практычным вопытам іншых краін.

У Швецыі ў некаторых сферах работадаўцы лічаць, што дэкрэтны адпачынак таты пазітыўна ўплывае на імідж арганізацыі. У прыватнасці, тут вельмі папулярна браць водпуск па доглядзе дзіцяці сярод паліцэйскіх. Лічыцца, што гэта выклікае ў насельніцтва большы давер да праваахоўнікаў. Магчыма, такі вопыт у пэўных сферах працы няблага было б пераняць і Беларусі. Аднак трэба ўлічваць розніцу паміж заробкамі мужчын і жанчын. Часта тата проста не можа сабе дазволіць узяць «дзіцячы» адпачынак, бо ён галоўны здабытчык сям'і, адзначаюць дэмографы.

— Нягледзячы на тое, што айчыннае заканадаўства прызнае да сем'яў і дазваляе пайсці ў дэкрэт не толькі маці і бацьку, але і бабулі ці дзядулі, на практыцы яно працуе не так актыўна. Толькі 1% беларускіх мужчын, згодна са статыстыкай, бяруць водпуск па доглядзе дзіцяці, асабліва ў недзяржаўных арганізацыях. Іх кіраўнікі са скепсісам ставяцца да жанчын дзетароднага ўзросту і не вельмі зацікаўлены ў іх працаўладкаванні, — зазначае **Алена КАСЬКО, намеснік прадстаўніка Фонду ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) у Беларусі.** — Чым больш мужчын будзе ісці ў дэкрэт, тым раней мы зменім погляд на гэтую справу.

— Вельмі важна, каб у сем'ях разумелі, што ў мацярынскай любові да дзяцей няма манаполіі, малым трэба атрымліваць яе і ад бацькі таксама, — падзяліўся **Лаўры ПУЛАЛА, кіраўнік аддзялення пасольства Фінляндыі ў Беларусі.** — У мяне самога трое дзяцей, і я тройчы максімальна выкарыстоўваў водпуск, які мог узяць па заканадаўстве. У сям'і маіх бацькоў нас было шасцёра, і амаль заўжды з намі быў тата, бо маці была занятая ў тэатры раніцай і ўвечары.

— Выхад татаў у дэкрэт у Беларусі ўскладняецца існаваннем устойлівых стэрэатыпаў, што выхаванне — жаночы занятак. Мужчына, які даглядае дзяцей, разглядаецца як беспрацоўны няўдачнік або рэвалюцыянер-правакатар, — мяркуе Алена Касько. — Таму мы і працуем з рознымі арганізацыямі, прапагандуючы стварэнне рабочай прасторы, прыязнай да бацькоў.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*



Жанчыны-палітыкі Фінляндыі актыўна змагаліся за прыняцце законаў, якія дазволілі б ім паралельна працаваць і мець сям'ю. Адзін з вынікаў праведзенай рэформы — так званыя бэбі-боксы, скрынкі з неабходнымі рэчамі для дзяцей, якія выдаваліся парадзіхам.

Нават у Фінляндыі — адной з самых спрыяльных краін для нараджэння дзяцей, усё роўна існуюць спрэчныя пытанні адносна ролі бацькі і маці ў сям'і.

— Ужо ў 1978 годзе фінскі бацька мог скарыстацца 12 днямі адпачынку па доглядзе малога. У 1980-м татам сталі гарантаваць больш працяглы адпачынак і дазволілі дзяліць яго з мамамі. Аднак альтэрнатыва прывяла да таго, што ў большасці такія водпускі бралі жанчыны, — расказвае **Ганне ЛАМІЛА, пасол па правах жанчын і гендарнага раўнапраўя (Фінляндыя).** — Як правіла, сучасныя жанчыны ў нас даглядаюць дзіця да года. Фінскія таты могуць узяць дэкрэтны водпуск на 9 тыдняў, а 26 тыдняў маці і бацька могуць падзяліць паміж сабой. Тым не менш да 90% гэтага часу па-ранейшаму карыстаюцца жанчыны. Арганізацыі па падтрымцы сем'яў адстойваюць прынцып 6+6+6 — шэсць месяцаў водпуску для мамы, шэсць — для таты і шэсць — на выбар кагосьці з іх. Закон дазваляе паспяхова сумяшчаць працу і гадаванне дзяцей. Існуюць спецыяльныя водпускі для бацькоў, магчымасць працаваць аддалена і па гнуткім графіку. Пры такім раскладзе аддача супрацоўнікаў павышаецца, бо чалавек можа лепш планаваць свой час, ён больш задаволены жыццём і шмат паспявае.

Цяпер у Фінляндыі рыхтуецца законапраект, які павінен рэгуляваць плацяжы для татаў, якія ў адзіночку выхоўваюць дзяцей, каб яны таксама маглі атрымліваць выплаты на малых, як і жанчыны.

# Планета Вясна,

## або Як заўважыць галоўнае

Выхавальніца зноў скардзілася на дачку: не хоча заплятаць валасы. Пры гэтым яна падняла вэрхал, выматала ўсім нервы і сарвала рэпетыцыю ранішніка, прысвечанага Жаночаму дню.

— Вось паглядзіце на яе, Наталля Генадзеўна, — гаворыць мне выхавальніца, на твары якой чытаюцца стома і раздражненне. — Такое ўражанне, быццам бы яна спецыяльна дэзарганізуе ўсіх навокал.

Я паглядзела на дачку. Ульяша сядзела насупіўшыся, са смешным хвастом на галаве, які звісаў на твар. Здавалася, што маё адно слова выкліча ў яе роў.

Абедзве расстроеныя ідзём дадому. На дарозе вялікія і глыбокія лужыны, а па краях бягуць хуткія ручайкі талай вады. У паветры адчуваецца пах вясны. Ульяна са злосцю тупае проста па сярэдзіне лужы. Іншым разам сказала б ёй, каб яна лужы абыходзіла, бо боты не гумовыя. Але зараз маўчу. Адчуваю, што любая мая заўвага надарве нешта крохкае ўнутры яе і тады адносны спакой усяго двара, а потым — усёй нашай кватэры з яе насельнікамі будзе парушаны. Такі ўжо ў яе характар.

— Мам, ма-а-ам, ты мяне пакараеш? — асцярожна, абрываючы мае нярадасныя думкі, пытае Ульяша.

— Не. Праўда, цябе перастала чакаць цукерка добрых паводзін...

— Ведаю...

— Чаму ты не хацела заплятаць валасы?

— Не хацелася.., — буркнула малая.

— Можа — ну гэтыя валасы! Хочаш, мы пастрыжом цябе каротка?

— Як хлопчыкаў, ці што?

— Не, як дзяўчынку. Толькі заплятаць валасы будзе не трэба.

— Не ведаю...

Увечары, калі ўсё наша сямейства пачало глядзець сны, я дастала нядаўнюю сваю пакупку. Днямі, натхніўшыся валасамі дачкі, якія толькі-толькі дасягнулі патрэбнай даўжыні, набыла ў краме шмат каляровых стужак і фігурных гузікаў. Тут былі і божыя кароўкі, і сонейкі, і сярэбраныя зорачкі, коцікі, птушкі... Хацелася ёй заколачкі і рызіначкі змайстраваць. І што мне цяпер з гэтым багаццем рабіць? Старшай дачцэ трынаццаць, яна ўжо не заплятае стужкі. Малодшай трошкі больш за год, у яе яшчэ коскі надта кароткія... А Ульяша мая... Ну, не хапае ў яе цярпення на прыгожыя прычоскі. Ёй усё трэба хутчэй ды адразу. І ўсё ж...

Змайстравала я банцікі з божымі кароўкамі. Ведаю, як яна любіць казурак. Не ўпэўнена, што гэтая любоў узаемная, але, як мне падалося, у яе сімпатыя да маленькіх істот устойлівая. З самага маленькага ўзросту яна збірае розных жучкоў, павучкоў, чарвячкоў, мух ды матылькоў і прыносіць іх мне, быццам трафей.

Цяпер казурак падару ёй я.

— Ух ты! Мама, ты гэта сама зрабіла? Ой, гэта ж рызіначкі!!! — Раніцай малая з захапленнем разглядала мой твор.

У садку Ульяша нешта напявала і прыскоквала, пакуль я яе заплятала. Яе далікатныя валасікі, здавалася, скакалі разам з ёй.

— Ой, Ульяна, якая ты прыгожая! — усклікнула выхавальніца. — Наталля Генадзеўна, вы калі заплятаеце дачку, у яе нават паводзіны паляпшаюцца. Сапраўдная прыгажуня-выдатніца.

Ульяна ад нечаканага камплімента аслупянела.

— А-а-а! Уся справа ў прыгожых косках, — гучна падтрымала я выхавальніцу. — Мы разгадалі твой сакрэт! Калі твае валасы заплецены ў гэтыя пяшчотныя коскі, то ты становішся маленькай добрай прыгажуняй. Так?

Ульяна здзіўлена стала чапаць свае коскі. Я паднесла яе да вялікага люстэрка. Малая паглядзела на сябе і задаволена ўсміхнулася.

— Мне здаецца, яна абавязкова атрымае сёння наклейку добрых паводзін.

— Нават не сумнявайцеся, — падтрымала я выхавальніцу і весела падміргнула.

У той дзень Ульяна сапраўды прынесла дадому дзве наклейкі за ўзорна-паказальныя паводзіны.

І я падумала: колькі ў нас, мацярок, улады. У нашых руках цэлы свет. Мы можам натхніць маленькіх людзей на вялікія подзвігі: працу над сабой, творчасць, увогуле — жыццё. Напоўненае любоўю, шчаслівае дзяцінства дапамагае чалавеку паверыць у сябе. Паверыць у дабро і справядлівасць, у тое, што яго жыццё годнае і патрэбнае.

Сёння майму дзіцяці патрэбны былі заколкі і коскі, а заўтра трэба будзе прыдумаць нешта яшчэ... І я прыдумаю.

Выхавальніцы добра падрыхтавалі дзяцей да ранішніка. Малыя выступілі выдатна.

Я глядзела на бацькоў, бабулек, дзядуль, брацікаў і сястрычак, якія прыйшлі падтрымаць сваіх блізкіх, глядзела, як яны смяяліся, падказвалі забытыя вершыкі, здымалі на фота- і відэакамеры, каб захаваць у памяці адзін цудоўны вясенні дзень. Глядзела на ўсхваляваных выхавальніц у святочных суконках. Яны шчыра ўсміхаліся памылкам сваіх гадаванцаў і шчыра ганарыліся іх выступленнем. Без іх працы, нерваў, душы не было б гэтага ранішніка...



У нас з Ульяшай быў выдатны настрой. У гэты дзень мы незвычайна рана вярталіся на нашу густа населеную «планету». Снегу амаль не засталося, птушкі смела пелі ўголас. Па дарозе мы зайшлі ў краму, каб набыць торцік. Нам хацелася падзяліцца сваім настроем з роднымі. Торт быў усыпаны смачнымі кветкамі. За сталом Ульяна весела шчабятала і расказвала пра свае ўражанні ад ранішніка. Старэйшая дачка слухала і ўсміхалася, сын шкадаваў, што не паспеў на свята, а малодшая задаволена размазвала торт па стале і па сабе.

На маёй «планеце» наступіла вясна. У калідоры будуць стаяць чатыры пары гумовых ботаў, мокрыя веласіпеды, самакат і каляска... Будзе шмат бруднага і мокрага дзіцячага адзення, сляды ад лап сабакі, абураны кот... Будзе Вялікдзень, першыя лісточкі, дзьмухаўцы... Усё гэта будзе, галоўнае — здолець гэта заўважыць.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.** *talivinskaya@zviazda.by*




### Уважаемые акционеры
## ОАО «Пищевой комбинат «Веселово»

**27 марта 2017 года** состоится годовое общее собрание акционеров **Открытого акционерного общества «Пищевой комбинат «Веселово»**,
Место нахождения:
Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, д. 24
Собрание пройдет по адресу:
Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, д. 24, актовый зал

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2016 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о работе в 2016 году.
Ознакомление акционеров Общества с заключением ревизионной комиссии по результатам проведения ежегодной ревизии за 2016 год.
Ознакомление акционеров Общества с аудиторским заключением, подготовленным по результатам проведения аудита годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2016 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности и распределения прибыли и убытков Общества за 2016 год.
5. Утверждение распределения чистой прибыли Общества за 2016 год. О выплате дивидендов за 2016 год.
6. О направлении использования чистой прибыли Общества на 2017 год.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета Общества.
8. Об избрании ревизионной комиссии Общества.
9. О размерах вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
10. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО "Пищевой комбинат «Веселово» путем изложения его в новой редакции.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, д. 24, кабинет юриста с 7 по 26 марта 2017 года с 9.00 до 16.00 либо 27 марта 2017 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания **с 10.00 до 10.45** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания 27 марта 2017 года, 11.00.**

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 03 марта 2017 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества (физическое лицо) – паспорт, руководителю юридического лица, являющегося акционером, – документ, подтверждающий его должностное положение и паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.** УНП 690277551

ОАО «Строительный трест №45», регистрационный номер 191760346, сообщает об утрате оригинала свидетельства о государственной регистрации юридического лица, выданного Минским горисполкомом 19 июля 2012 г. за №0042762. О находке просим сообщить по контактным телефонам: +375(44) 598-66-27, 8(017) 254-77-41. УНП 191366886

# ИЗВЕЩЕНИЕ

### о проведении 21 марта 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Административное помещение с инв. №500/D-708150242, общая площадь 2008,7 кв. м; теплосети (инв. №01-178); электросети (инв. №01-169); сети водопровода (инв. №01-170) | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 1 159 748,32 | 100 000,00 |
| 2 | Административное помещение с инв. №500/D-708150241, общая площадь 11,7 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 26 | 11 791,17 | 1 100,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г. Минск.
**Организатор торгов:** коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.
**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся 21 марта 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 09.03.2017 по 17.03.2017 включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36
(коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»);
(017) 200-99-78, (029) 350-46-23
(ОАО «Минскремстрой»).

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### по продаже в частную собственность гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Организатор аукциона – Ивенецкий поселковый исполнительный комитет Воложинского района Минской области

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Лот №1 г. п. Ивенец, ул. Полевая, 24, кадастровый номер 622055400050000020 | 0,15 га | Вблизи водоснабжение, ЛЭП, газ | 6 563 | 1 313 | 1 054 |

Задаток перечисляется на р/счет 3600614020508 ГУ МФ РБ по Минской области ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск код 795 УНП 600537220 Ивенецкий поселковый исполнительный комитет, код платежа 04901.
Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации и объявления в газету.
Аукцион состоится 4 апреля 2017 года в 10.00 по адресу: Воложинский район, г. п. Ивенец, пл. Свободы, 2.
Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 29 марта 2017 года (последний день подачи заявления 29 марта 2017 г. до 17.00) по адресу: Воложинский район, г. п. Ивенец. пл. Свободы, 2.
Контактные телефоны:
(801772) 53526 , 51843.

# ИЗВЕЩЕНИЕ

### о проведении открытых торгов в форме аукциона о предоставлении права на заготовку и (или) закупку виноградной улитки (Helix pomatia) на территории Шарковщинского района Витебской области

| Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона*, рублей | Сумма задатка*, рублей |
|---|---|---|---|
| Право на заготовку и (или) закупку виноградной улитки (Helix pomatia) на территории Шарковщинского района Витебской области | В соответствии с заключением, предоставленным Национальной академией наук Беларуси, промысловый запас виноградной улитки составляет 6800 килограммов, предельно допустимый объем изъятия составляет 3400 килограммов | 437 | 175 |

***Примечание:*** * оплата производится в белорусских рублях исходя из размера базовой величины, установленной на день оплаты.
ОРГАНИЗАТОР – Шарковщинский районный исполнительный комитет, 211921, Витебская область, г. п. Шарковщина, ул. Комсомольская, 15, контактный телефон: (02154) 41636, факс 41500, сайт: sharkrik@vitebsk.by
ПРОДАВЕЦ – Шарковщинский районный исполнительный комитет, 211921, Витебская область, г. п. Шарковщина, ул. Комсомольская, 15, контактный телефон: (02154) 41636, факс 41500.
1. Аукцион состоится 4 апреля 2017 года в 15.00 по адресу: 211921, Витебская область, г. п. Шарковщина, ул. Комсомольская, 15, каб. 6.
2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь. Участнику необходимо в адрес организатора предоставить:
заявление на участие в аукционе;
копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий счет организатора аукциона, заверенная банком;
юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;
- индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность;
представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
3. Документы, необходимые для участия в аукционе, принимаются организатором аукциона по адресу: 211921, Витебская область, г. п. Шарковщина, ул. Комсомольская, 15, кабинет 87 с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням.
4. Последний день приема документов – 28 марта 2017 года до 17.00. Заключительная регистрация участников 29 марта 2017 года с 12.00 до 14.30. К участию не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.
5. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на текущий счет 3604330004603 в ЦБУ №224 филиала №216 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 648, УНП 300168711, получатель платежа – Шарковщинский районный исполнительный комитет.
6. Организатор аукциона после опубликования извещения о проведении аукциона вправе снять предмет с аукциона до его проведения в случаях отсутствия участников аукциона либо наличия только одного участника аукциона. При этом комиссия составляет протокол о снятии с аукциона предмета аукциона и признании аукциона несостоявшимся.
7. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене.
8. Если ни один из участников аукциона не желает приобрести предмет аукциона по первой названной аукционистом цене, аукционист называет эту цену трижды и снимает данный предмет аукциона с аукциона, о чем комиссией составляется протокол.
9. Аукцион проводится в соответствии с Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. №699.
10. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Согласие либо отказ такого лица приобрести предмет аукциона отражается в протоколе аукциона. Лицу, выразившему согласие приобрести предмет аукциона, сумма внесенного задатка засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.
11. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий счет сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение согласно протоколу аукциона.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ

### о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества | Лот №1. Капитальное строение инв. №240/С-38555, наименование – гараж, составные части и принадлежности: подвал, смотровая яма. Первоначальная стоимость – 7400,00 руб. |
| Собственник (владелец) имущества | Крымовская Татьяна Петровна |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Барань, ул. Сорокина, 11А/144 |
| Информация об обременениях | Без обременений |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 8<br>28 марта 2017 года в 11.00 |
| Справочная информация | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, 211030, г. Орша, ул. Островского, 36<br>Заведующий сектором – Чеканова Татьяна Николаевна, тел.: 80216543201, 80333996054.<br>Начальник отдела – Павлюченкова Наталья Евгеньевна, тел. 80216543213 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши №3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 30002505, не позднее 27.03.2017 г. 12.00<br>Минимальная величина первого шага – 5% от стоимости каждого лота.<br>В соответствии с ч. 6 ст. 516 ГПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

### на право заключения договора аренды земельного участка для размещения цеха по обработке древесины в г. Поставы, ул. Космонавтов, Витебской области

| Дата, время, место проведения аукциона | **20 марта 2017 года в 10.00** в здании Поставского райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, малый зал) | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адреса, площади, кадастровые номера земельных участков, начальная цена | № лот | Адреса участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Наличие ограничений в использовании | Начальная цена, руб. | Расходы, связанные с проведением аукциона, подготовка документации, связанная с его проведением, руб. | Сумма задатка, руб. |
| | 1 | Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Космонавтов | 0,3940 | 224050100002000682 | Земельный участок имеет ограничения в связи с расположением в охранной зоне электрических сетей | 6 330,44 | 2527,43 | 633,044 |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона | -в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона и возместить расходы, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения;<br>- не позднее 2 рабочих дней после внесения платы и возмещения расходов заключить с Поставским райисполкомом договор аренды земельного участка, получить выписку из решения райисполкома, и протокол о результатах аукциона;<br>- в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться в Поставское бюро Глубокского филиала республиканского унитарного предприятия «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией в отношении земельного участка, но не позднее трех месяцев со дня подписания протокола аукциона;<br>- получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство;<br>- приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство) в течение шести месяцев со дня государственной регистрации земельного участка | | | | | | | |
| Порядок осмотра на местности земельного участка | В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе.<br>Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома: г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11 | | | | | | | |
| Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала | - заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);<br>- квитанция об уплате задатка;<br>- ксерокопия стр. 25, 31, 32,33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования;<br>- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность,<br>- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;<br>- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица | | | | | | | |
| Место, дата и время начала и окончания приема заявлений | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11,<br>в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации извещения до 19.03.2017 включительно | | | | | | | |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения | 10% от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет Поставского райисполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе | | | | | | | |
| Адрес и номер контактного телефона комиссии | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11,<br>в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), телефоны: 8 (02155) 43180,41132 | | | | | | | |
| Примечание | Ранее извещение о проведении аукциона было опубликовано 27 января 2017 г. в газете «Звязда» | | | | | | | |

# Ішлі ў бой... жанчыны

## У гады Вялікай Айчыннай вайны яны нароўні з мужчынамі змагаліся за Перамогу

**Прычым большасць з іх змяніла прыгожую сукенку на вайсковую форму не па загадзе. Жанчыны былі на вайне не толькі медсёстрамі і сувязісткамі, а і кіравалі ваеннымі эшалонамі, змагаліся ў складзе танкавых экіпажаў, знішчалі ворага з неба, хадзілі ў разведку, падрывалі варожую тэхніку, былі зенітчыцамі і нават снайперамі...**

Паколькі на пачатку вайны ўлік жанчын-франтавічак не вёўся, па прыблізных звестках у Чырвоную Армію было прызвана ад 600 да 800 тысяч жанчын. У партызанскіх атрадах і падполлі іх было каля 70 тысяч. А колькі жанчын набліжала Перамогу ў тыле ворага і ў эвакуацыі!

Некаторыя імёны гэтых адважных жанчын, здаецца, сёння вядомы ўсяму свету: Зоя Касмадзям'янская, Людміла Паўлічэнка, Зінаіда Тусналобава-Марчанка, Лілія Карастаянава, Зінаіда Партнова, Марыя Осіпава, Алена Мазанік, Надзея Траян... Побач з імі змагаліся з ворагам не менш адважныя прыгажуні, многім з якіх подзвіг каштаваў жыцця.



Марыя **АКЦЯБРСКАЯ** аддала ўсе свае зберажэнні на вытворчасць танка «Баявая сяброўка» і стала членам экіпажа.

## Гераіні на бране

Марыя Акцябрская стала ў армейскія шэрагі пасля таго, калі ў 1941 годзе пад Кіевам загінуў яе муж. Пасля трагічнай весткі Марыя Васілеўна папрасілася на фронт, але з-за немаладога ўзросту (36 гадоў) і перанесеных сухотаў атрымала адмову. Тады жанчына аддала ўсе свае зберажэнні на вытворчасць танка «Баявая сяброўка». А калі танк выйшаў з канвеера, увайшла ў яго экіпаж. Будучы механікам-кіроўцам, удзельнічала ў вызваленні Віцебскай вобласці. У ноч на 18 студзеня 1944 года ў баі за вёску Крынкі Лёзненскага раёна нанесла немалую шкоду ворагу. Падчас ліквідацыі пашкоджання свайго «жалезнага каня» была цяжка паранена. Урачы доўга змагаліся за яе жыццё, але ў сакавіку жанчыны не стала... Пасмяротна Марыі Акцябрскай прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза.

У танкавых войсках ваявала і Аляксандра Самусенка — адзіная жанчына-танкіст 1-й гвардзейскай танкавай арміі ў гады Вялікай Айчыннай і адзіная жанчына, якая займала пасаду намесніка камандзіра танкавага батальёна. З'яўлялася адным з найлепшых афіцэраў танкавай брыгады. Аляксандра Рыгораўна была тройчы паранена, два разы гарэла ў танку. І кожны раз вярталася на фронт. Чацвёртае раненне, атрыманае перад самай Перамогай, стала для яе ракавым...

## Без белых халатаў і анестэзіі

Падлічана, што прыкладна 73% параненых вярталіся ў шэрагі Чырвонай Арміі дзякуючы франтавым медыкам. Ваенны фельчар Раіса Абакумава і медсястра Вера Харэцкая аказвалі медыцынскую дапамогу героям Брэсцкай крэпасці. У цытадэлі Раіса Абакумава стварыла імправізаваны шпіталь, арганізавала дзяцей і жанчын на дапамогу параненым. Не аднойчы пад агнём праціўніка здабывала для іх ваду. Калі Гаўрылаў загадаў усім жанчынам і дзецям здацца, яна засталася ў крэпасці. Трапіла ў палон разам са сваёй маці. Па дарозе ў Брэст ім удалося ўцячы, але за некалькі дзён да вызвалення жанчына апынулася на прымусовых работах у Германіі. Пасля вайны доўгі час Раісу Абакумаву лічылі зніклай без вестак.

Вера Харэцкая загінула ў першыя дні вайны. Дзевятнаццацігадовая медсястра закрыла сваім целам параненага байца, якому рабіла перавязку. Не стала абаіх...

За Зіну Тусналобаву ішлі ў бой танкісты і зенітчыкі, стралкі і лётчыкі. Толькі перш старшына медыцынскай службы вынесла з поля бою 123 параненых (і гэта за 8 месяцаў на фронце!). Было б і больш, калі б не цяжкае раненне ў адным з баёў. Жанчына амаль двое сутак праляжала на марозе сярод трупаў. З ампутаванымі рукамі і нагамі яна працягвала змагацца з ворагам — толькі ўжо на ідэалагічным фронце.

Муж Зінаіды Тусналобавай, нягледзячы на калецтва жонкі, быў побач з ёй усё жыццё. Больш таго, яна нарадзіла яму чацвярых дзяцей. А між іншым, толькі ачуняўшы ад ампутацыі, у сваім лісце да мужа яна прасіла яго знайсці іншую жонку. «Мілая мая малышка! Родная мая пакутніца! — адказаў ёй Іосіф. — Няма такога гора, няма такіх мук, якія прымусілі б забыць цябе, мая каханая. І ў радасці, і ў горы мы заўсёды будзем разам...»

Зінаіда Тусналобава-Марчанка стала лаўрэатам прэстыжнай узнагароды Міжнароднага Чырвонага Крыжа — медаля «Флорэнс Найтынгейл». Усяго за гады існавання СССР яго атрымалі 46 савецкіх жанчын.

## У небе — «начныя ведзьмы»

За гады вайны больш як тры тысячы тон бомбаў скінулі на ворага «начныя ведзьмы». На лятаючых этажэрках, як называлі лёгкаматорныя самалёты, да 1944 года ўзброеныя толькі пісталетамі ТТ, жанчыны здзяйснялі па 6 — 8 вылетаў за ноч зімой і па 10 — 12, а часам і 18 вылетаў летам. 32 лётчыцы 46-га гвардзейскага начнога бамбардзіровачнага авіяцыйнага Таманскага палка загінулі.

Не дачакалася Перамогі і беларуска Галіна Дакутовіч. Дзяўчына яшчэ да вайны скончыла Гомельскі аэраклуб, вучылася ў Маскоўскім авіяінстытуце. Калі пачалася Вялікая Айчынная, добраахвотна пайшла на фронт. Скончыла Энгельскую авіяцыйную школу. Ужо падчас навучання ў якасці штурмана выконвала адказныя палёты на цяжкім бамбардзіроўшчыку ТБ-3. З лета 1942-га яна — штурман у 46-м гвардзейскім авіяпалку. Аднойчы пасля шматлікіх вылетаў дзяўчына была настолькі стомленай, што выйшла з самалёта і лягла на траву адпачыць. Не заўважыла, як заснула. Раніцай яе пераехаў бензавоз, які запраўляў самалёты палівам. Галіна атрымала моцную траўму пазваночніка. Пасля лячэння ў шпіталі яе адправілі ў тыл, але дзяўчына схавала прадпісанне і вярнулася на фронт. Нягледзячы на невыносны боль, працягвала лятаць і нават была штурманам палка.



Галіна **ДАКУТОВІЧ**, адна з «начных ведзьмаў», лятала, нягледзячы на сур'ёзную траўму пазваночніка, і была штурманам палка.

1 жніўня 1943 года, вызваляючы землі Новарасійска і Кубані, гамяльчанка згарэла ў самалёце. У тую ноч не стала адразу чатырох жаночых экіпажаў. Гэта была самая буйная страта сярод «начных ведзьмаў» у адным баявым вылеце. Пахавана Галіна Дакутовіч у брацкай магіле ў сяле Рускае, што ў Краснадарскім краі. Пасмяротна ўзнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі.

Быў час, калі разам з Дакутовіч лятала і адна з самых рэзультатыўных лётчыц — Ірына Сяброва. Яна ўдзельнічала ў баях на Каўказе, вызваляла Крым, Беларусь, бамбіла Берлін... На ліку Героя Савецкага Саюза — каля тысячы баявых вылетаў.

## Па закліку сэрца

Нямала жанчын змагалася з гітлераўцамі ў партызанскіх атрадах і падполлі, працавала на карысць Радзіме на акупаванай тэрыторыі і ў савецкім тыле.

Вольга Шчарбацэвіч, адна з 12 ахвяр першага масавага публічнага пакарання, якое адбылося ў Мінску 26 кастрычніка 1941 года, да вайны працавала ў 3-й бальніцы Мінска. Калі горад быў заняты ворагам, яна стала дапамагаць ваеннапалонным. Ужо на трэці дзень акупацыі разам з сяброўкай жанчына пракралася ў мясцовае аддзяленне паліцыі і знайшла там бланкі незапоўненых пашпартоў. Дзякуючы падробленым дакументам яны вызвалілі нямала ваеннапалонных. Лячылі параненых і выводзілі ў бліжэйшыя вёскі або ў партызанскія атрады. Вольга Шчарбацэвіч была закатавана і павешана на вачах у свайго сына, якога ў той жа дзень чакаў такі ж лёс, як у маці.

Рыма Кунько ў свае 17 гадоў была камандзірам дыверсійнай групы асобага партызанскага атрада імя Ракасоўскага, які дзейнічаў у Магілёўскай вобласці. Асабіста ўдзельнічала ў падрыве 8 эшалонаў ворага. Падчас аднаго з заданняў яе група трапіла ў засаду. Адстрэльвалася да апошняга патрона, а потым першая кінулася ў атаку. Загінула 1 ліпеня 1944 года, адзін дзень не дажыўшы да вызвалення родных Асіповічаў.

Будучы машыністам паравоза, Алена Чухнюк у складаных і адказных момантах перавозіла на фронт цяжкія грузы. Летам 1943-га, дастаўляючы на Курскую дугу эшалон з тэхнікай, яна сем разоў трапіла пад бамбёжку, але нават раней тэрміну груз прыбыў на месца прызначэння. За паспяховую дастаўку грузаў на фронт, у тым ліку на Курскую дугу, у 1943 годзе жанчына была ўзнагароджана зоркай Героя Сацыялістычнай Працы.

Марыя Шляхценка і Любоў Грыцкова былі настаўніцамі ў першай лясной школе, створанай у партызанскай зоне Брэсцкай вобласці. Жанчыны вучылі дзяцей пад адкрытым небам з дапамогай спадручных сродкаў. Калі даведаліся пра вызваленне Мінска, спусціліся ў зямлянку, каб як мага гучней парадавацца (на вуліцы было небяспечна — недалёка знаходзіліся немцы). Шчасце было кароткім: менавіта ў іх зямлянку ўпала авіябомба...

Пра подзвіг Пелагеі Барадзіной з Веткі мы падрабязна пісалі ў нумары ад 20 чэрвеня 2015 года. Нагадаем, жанчына арганізавала эвакуацыю калгаснай скаціны ў Саратаўскую вобласць. На працягу пяці месяцаў па тысячакіламетровым шляху, які пралягаў праз пяць абласцей, племянны статак з 700 галоў гналі падлеткі і жанчыны — усяго 14 чалавек. Трапляючы пад бамбёжкі, яны не толькі выратавалі народнае дабро, а яшчэ часткова вярнулі яго на Радзіму пасля вызвалення.

Некаторыя беларусы, якія з розных прычын апынуліся на чужой тэрыторыі, удзельнічалі ў еўрапейскім руху Супраціўлення. Сярод іх была і Надзея Лісавец, якая перш змагалася з ворагам у савецкім падполлі. Сваю дзейнасць працягвала ў партызанскім атрадзе «Радзіма», які дзейнічаў у французскіх лясах. Але дзеля гэтага ёй удалося збегчы з лагера ў Францыі, дзе жанчына працавала на шахтах. На вяртанні ў Беларусь яе чакаў незайздросны лёс: адсутнасць дакументаў, прабыванне ў фашысцкім лагеры. На шчасце, адзін з партызанскіх камандзіраў пазнаў у ёй сваю сувязную.

Трагічны лёс склаўся ў Тацяны Барамзіной. На фронт жанчына пайшла снайперам, але праз некалькі месяцаў у яе рэзка пагоршыўся зрок і яе хацелі камісаваць. Але яна ўпрасіла камандзіра і перавучылася на тэлефаністку. Разам са сваімі абавязкамі падчас баёў у Мінскім катле дапамагала параненым. Была кругавая абарона, і калі Таццяна заўважыла, што фашысты апынуліся побач, схапіла снайперскую вінтоўку і пачала страляць. Уварваўшыся ў бліндаж, немцы расстралялі ўсіх параненых, а Таццяну — ва ўпор з супрацьтанкавай зброі. Свае апазналі яе толькі па валасах і гімнасцёрцы...



Таццяну **БАРАМЗІНУ**, якая са снайперскай вінтоўкі знішчыла не аднаго немца, расстралялі з супрацьтанкавай зброі.

Самым жудасным чынам немцы здзекаваліся амаль над кожнай жанчынай, якая трапляла ў іх рукі жывой. Асабліва ненавідзелі жанчын у вайсковай форме. На думку фашыстаў, ваяваць — мужчынская доля. І з гэтым цяжка не пагадзіцца. Але гэта не пра савецкіх жанчын.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

***За падрыхтоўку публікацыі аўтар выказвае ўдзячнасць малодшаму навуковаму супрацоўніку аддзела навукова-асветніцкай работы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Тацццяне Палітыка.***



У сям'і **РЫДЛЕЎСКІХ** разам з бацькам у партызаны пайшлі дзве дачкі.

# БЯЛЫНІЧЫ — ГОРАД ЗРУЧНЫ ДЛЯ БІЗНЕСУ І ПРЫВАБНЫ ДЛЯ ТУРЫЗМУ

**Старшыня Бялыніцкага райвыканкама Мікалай КАДАЦЕНКА:**



— Бялыніцкі раён з'яўляецца ўязнымі варотамі на тэрыторыю Прыдняпроўскага краю. Праз горад праходзіць міжнародная траса М-4, якая злучае Мінск і Магілёў. З пункту гледжання лагістыкі, гэта выдатная пляцоўка для прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу, рэалізацыі іх інвестпраектаў. Тут паспяхова працуюць прадпрыемствы рознай уласнасці. Дастаткова згадаць унікальны для вобласці пратэінавы завод, які займаецца перапрацоўкай адходаў жывёлагадоўлі. На карце раёна размешчаны аграсядзібы, базы адпачынку, фермерскія гаспадаркі, паляўнічыя ўгоддзі, аб'екты прыдарожнага сэрвісу. Наш край багаты на лясы і ўнікальныя азёры ледніковага паходжання. Спадзяюся, што знаёмства з Бялыніцкім раёнам будзе спрыяць узаемавыгадным эканамічным сувязям, дапаможа наладзіць сяброўскія і партнёрскія адносіны ва ўсіх сферах дзейнасці.

Вясна — цудоўная нагода для пачатку новых спраў і адносін. Гэта пара росквіту і спадзяванняў. Нездарма менавіта ў сакавіку мы адзначаем прыгожае жаночае свята. Жанчына, як вядома, пачатак усіх пачаткаў. Хочацца пажадаць усім суайчынніцам здзяйснення жаданняў і плённай працы, а нашым прыгажуням і надалей заставацца такімі ж прывабнымі, добрымі і мудрымі, якімі яны з'яўляюцца па жыцці. І хай нашы надзеі спраўджваюцца.

# У НАЙЛЕПШЫХ ТРАДЫЦЫЯХ МАГДЭБУРГСКАГА ПРАВА

**Бялынічы вось ужо месяц прывыкаюць да новага статусу. Былы гарадскі пасёлак стаў горадам. Гэта, што ні кажы, прэстыжна. Але калі ўспомніць гісторыю, то населены пункт ужо быў калісьці горадам і нават меў Магдэбургскае права.**

## БІЗНЕС НА ВЁСЦЫ — ГЭТА ПЕРСПЕКТЫЎНА

Сёння Бялынічы — сучасны і ўтульны для жыцця горад з насельніцтвам больш за 10 тысяч чалавек. Ён расце і развіваецца, у яго эканоміцы занятыя больш як 7,5 тысячы чалавек.

— Летась у раёне было створана 29 новых працоўных месцаў, — расказвае **намеснік старшыні Бялыніцкага райвыканкама Алена КОТАСАВА.** — Напрыклад, калгас «Радзіма» заняўся перапрацоўкай рапсу і запрасіў на працу 6 чалавек. Яшчэ 6 чалавек задзейнічаны на вытворчасці новага прыватнага прадпрыемства «Пелетайзер», якое спецыялізуецца на пелетах. Яго стваральнікі плануюць працаваць з краінамі Еўропы.

Сёлета мяркуецца стварыць 45 рабочых месцаў. Ёсць надзея, што новыя вытворчасці хутка з'явяцца на трох незадзейнічаных пакуль аб'ектах. Усе яны ў сельскай мясцовасці, але попыт на іх ёсць. І гэта радуе. Бо там дзе работа, там і людзі. А значыць, вёскі будуць працягваць жыць. Многія пачынаюць разумець, што сёння проста гандлем займацца не зусім выгадна, лепш арганізаваць вытворчасць і ствараць прадукт з высокай дабаўленай вартасцю.



У раёне зацікаўлены ў прадпрымальных людзях, якія зоймуцца больш глыбокай перапрацоўкай драўніны або перапрацоўкай грыбоў і ягад, якіх у бялыніцкіх лясах вельмі шмат.

## НЕ ГОРШ, ЧЫМ У СТАЛІЦЫ

Адчуць сябе гараджанінам у Бялынічах зусім проста. Ёсць вялікі сучасны Дом культуры з глядзельнай залай на 350 месцаў, залай для правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў і дыска-залай. За кошт сродкаў ад суботніка адрамантаваны музей. Раней такім жа чынам быў зроблены рамонт кінатэатра, дзе зараз устаноўлена сучаснае 3D-абсталяванне. Так што сусветныя кінапрэм'еры жыхары Бялыніч глядзяць разам з мінчанамі. На базе фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Друць» функцыянуюць пляцоўкі па міні-футболе і гандболе з глядзельнымі трыбунамі на 750 месцаў. «Гэта дазваляе нам праводзіць спаборніцтвы не толькі раённага ўзроўню, але нават рэспубліканскага і міжнароднага маштабу, — адзначае **намеснік старшыні Бялыніцкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Андрэй ГАНЧУК**. — У рамках чэмпіянату Беларусі ў нас сустракаліся гандбольныя каманды. А на міжнародныя турніры прыязджаюць госці з Расіі, Прыбалтыкі. Ёсць шыкоўны басейн на 5 дарожак. Па прапанове жыхароў зрабілі пляцоўку для гульні ў гарадкі таксама з улікам міжнародных патрабаванняў. Тут праводзіўся абласны турнір сярод аматараў гарадошнага спорту.



Пра медыцынскія паслугі асобная размова. Да тутэйшых медыкаў прыязджаюць з Магілёва і нават Мінска.

— А што тут дзіўнага? — паціскае плячыма Андрэй Ганчук. — Мы забяспечаны ўрачамі і сярэднім медперсаналам на ўсе 100%, чым сёння можа пахваліцца далёка не кожны раён. У нас моцнае лабараторна-дыягнастычнае абсталяванне. Ёсць абсталяванне, якое дапамагае высвеліць стан органа зроку ўсяго за паўхвіліны. За некалькі секундаў можна зрабіць экспрэс-аналіз крыві. Асвоены і працягваюць укараняцца новыя віды лапараскапічных аперацый. Развіта аказанне дадатковых платных паслуг. Летась на гэтым наша медыцына зарабіла больш за 345 тысяч новых рублёў. Гэтыя грошы ідуць на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы і закупку расходных матэрыялаў. Зараз усталёўваем новы рэнтген-апарат з тамографам на 3 працоўныя месцы. Абсталяванне дазволіць рабіць дыягностыку тых органаў, якія немагчыма было праверыць раней. Так што наша медыцына стане яшчэ бліжэйшай да чалавека.

# Па ўраджанні — у «Новую Друць»

**Сёлета гэта адно з найбуйнейшых аграпрадпрыемстваў Магілёўскай вобласці будзе збіраць першы ўраджай жэньшэню. Інавацыйны бізнес-праект быў запушчаны тут у 2011 годзе. Спадзяванні на яго вялікія. Культура родам з Кітая, капрызная і абы-дзе расці не будзе. А вось тут, у Бялыніцкім раёне, узяла і прыжылася.**

## І КОРАНЬ ЖЭНЬШЭНЮ НА ДАЛОНІ

Не дзіўна, што і знаёмства з гаспадаркай пачалося менавіта з жэньшэню. Яе кіраўнік Анатоль Драздоў прапаноўвае ехаць на месца і паглядзець, як зімуе кітайскі госць. Хоць ён тут ужо даўно не госць, і беларускія маразы яго зусім не пужаюць. Вунь нават дах з цяпліцы знялі. Адзінае, чаго баіцца расліна, дык гэта зацяжнога дажджу. Для яе паліву летам выкарыстоўваецца спецыяльная, крапельнага тыпу сістэма. А яшчэ жэньшэню патрэбны паўзмрок. Таму ад прамых сонечных прамянёў яго тут прыкрываюць цёмнай плёнкай.



Анатоль ДРАЗДОЎ збірается пашыраць жэньшэневыя плантацыі.

— Мы адзіныя ў краіне займаемся вырошчваннем жэньшэню, — удакладняе дырэктар. — Ужо нават і насенне сваё ёсць. Зараз вывучаем рынкі збыту, глядзім, куды выгадней прадаваць цуда-корань. Па эканамічных падліках, рэнтабельнасць ад яго рэалізацыі павінна скласці каля 30%. Таму плануем павялічваць пасяўныя плошчы.

## ПРЫКЛАД ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ

«Новая Друць» наогул передавое сельгаспрадпрыемства. Гэта адзін з яскравых прыкладаў, як сёння можна паспяхова развівацца адразу па некалькіх кірунках.

— Наша таварыства аб'яднала 6 гаспадарак, на яго тэрыторыі знаходзіцца больш за сотню вёсак, 3 сельскія саветы, — кажа Анатоль Драздоў. — Агульная плошча гаспадаркі каля 20 тысяч гектараў, з іх 17 тысяч — сельгасугоддзі. Асноўная дзейнасць прадпрыемства — жывёлагадоўля, 60% выручкі за год атрымліваем менавіта ад яе. Развіваем раслінаводства, што дае магчымасць цалкам забяспечыць сябе кармамі. Дадаткова займаемся бульбай, маем нават крухмальны завод для яе перапрацоўкі. Ёсць таксама падсобныя вытворчасці па дрэваапрацоўцы, цэх мінеральнай пітной вады, швейны цэх. Больш за 140 гектараў тэрыторыі займае сад. Нашы яблыкі карыстаюцца попытам у Расіі.

Даглядаць вялікую гаспадарку дапамагае якасная тэхніка. Анатоль Драздоў запрашае на машынны двор і з задавальненнем дэманструе «атрад» трактароў МТЗ. Тэхніка выглядае так, што хоць сёння гатова рынуцца на палеткі. Потым ідзём глядзець рэдкі для гаспадарак нашай краіны бульбаўборачны камбайн ДэВулф. Галоўны механік Дзяніс Смалякоў з яго парушынкі здувае. Тэхніка аж блішчыць.



Анатоль ДРАЗДОЎ з галоўным механікам Дзянісам СМАЛЯКОВАМ на фоне рэдкай для гаспадарак Беларусі тэхнікі — бульбаўборачнага камбайна ДэВулф.

## КАБ ПРАЦА БЫЛА НА ВЫНІК

Кіраўнік вялікай гаспадаркі Анатоль Драздоў жыве па прынцыпе: дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся. Калісьці ён, перспектыўны студэнт Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, меў усе шанцы застацца ў навуцы. Але жаданне працаваць на зямлі перамагло. Вярнуўся дадому і амаль 16 гадоў узначальваў гаспадарку «Падзевічы». Потым стаў дырэктарам «Новай Друці», а былая гаспадарка хутка ўвайшла ў яе склад. ААТ «Новая Друць», у сваю чаргу, з'яўляецца дачынай арганізацыяй агракамбіната «Мачулішчы» і знаходзіцца ў сістэме Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. Гаспадарка працуе стабільна, працягвае паспяхова развівацца. Сёлета ў планах пабудаваць сховішча для яблыкаў, перавесці на мясцовыя віды паліва кацельню крухмальнага завода. Працуюць тут і над тым, каб зменшаць затраты. Гэта дасць магчымасць функцыянаваць яшчэ больш эфектыўна.

Летась спраў у Анатоля Драздова прыбавілася. Ён быў абраны ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. Вопыт у яго багаты, праблемамі людзей па роду сваёй дзейнасці заўсёды займаўся. Зараз па дапамогу ідуць і тыя, хто ніякіх адносін да гаспадаркі не мае. У цесным кантакце сенатар працуе з сельвыканкамамі. Старшыня Цяхцінскага сельсавета Аляксандр Цыбульскі з удзячнасцю кажа пра яго дапамогу па афарбоўцы помнікаў загінулым у гады вайны. Пад апекай знаходзяцца ветэраны і малалетнія вязні вайны, якім кіраўнік «Новай Друці» дапамагае з дровамі і апрацоўкай прысядзібных участкаў. Пад крылом аграпрадпрыемства ўсе сацыяльныя аб'екты, што размешчаны на яго тэрыторыі. Сярод іх 5 школ і 6 дзіцячых садкоў. Дырэктар Цяхцінскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад – сярэдняя школа Аляксандр Мамчанка паведаміў, што гаспадарка рэгулярна забяспечвае іх прадуктамі, агароднінай і садавінай, дапамагае рабіць рамонт, выдзяляе транспарт. У насельніцтва ёсць добрая магчымасць набываць прадукцыю гаспадаркі ў яе фірменных крамах. Цяпер іх тры, але хутка адкрыецца чацвёртая ў Бялынічах. Ёсць свая гасцініца, кавярня, сталовая. Для спецыялістаў пабудавана камфартабельнае жыллё. Усе зроблена для таго, каб у чалавека быў толькі адзін клопат — працаваць на вынік.

УНП 700082413

# РУЛЬ У НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ

**У будны дзень у аўтобусе па маршруце Магілёў — Бялынічы пасажыраў няшмат. Едзеш, як пан, і думаеш: гэта ж колькі страт нясе перавозчык! І за кошт чаго ён толькі існуе?**

Гэта пытанне проста само сарвалася з языка, як толькі мы сустрэліся з **дырэктарам бялыніцкага аўтапарка №7 Сяргеем ГАПЕЕВЫМ**.

— Прыбытку ад пасажырскіх перавозак ніколі не было, — тлумачыць ён. — Гэта больш сацыяльны від паслуг. Без іх наша грамадства абысціся ніяк не зможа. Бо нашы канкурэнты — нелегалы, якія забіраюць пасажыраў на самых прыбытковых маршрутах, займацца гэтым не хочуць. Яны працуюць, каб ім было выгадна. А сацыяльныя маршруты, якімі карыстаюцца ў асноўным пажылыя людзі, студэнты і ўсе тыя, у каго не вельмі вялікія даходы, іх не цікавяць.

З 19 пасажырскіх маршрутаў, па якіх курсіруюць аўтобусы бялыніцкага аўтапарка, толькі адзін мае міжгародні статус — да Бабруйска,



Пасажырам падабаецца, калі на маршруце працуе Уладзімір СТРУНОВІЧ.

яшчэ 2 маршруты гарадскія, астатнія 16 — прыгарадныя. Перавозкай займаюцца штодзённа 9 аўтобусаў. Зіма, вядомая рэч, не сезон. А вось як толькі пачынаецца пасяўная, план па перавозках выконваюць дачнікі. Праўда, доход ад гэтых пасажыраў невялікі. Бо большая частка з іх — гэта пенсіянеры, якім даецца 50-працэнтная льгота па аплаце праезду.

Летам аўтапарк крыху зарабляе на турыстычных паездках. Знаходзяцца ахвотныя з'ездзіць у Нясвіж, Мір, Жыровічы. У асноўным па лініі ўстаноў культуры і адукацыі, якія арэндуюць транспарт на розныя культмасавыя мерапрыемствы. Але гэта таксама не валаўтваральная паслуга.

Асноўны даход бялыніцкаму аўтапарку №7 прыносіць менавіта міжнародныя грузавыя перавозкі. Іх удзельная вага ў агульнай структуры даходаў складае 33%. Яшчэ 28% прыходзіцца на ўнутраныя грузаперавозкі, заказчыкамі якіх з'яўляюцца розныя дарожна-будаўнічыя фірмы.

На ўзбраенні аўтапарка 24 грузавыя аўтамабілі, з якіх 9 цягачоў. Апошнія без работы не прастойваюць.

— Хутка адна з машын адправіцца ў Краснаярск з магілёўскімі ліфтамі, яшчэ дзве павезлі грузы ў Растоў-на-Доне і Казань, — расказвае **інжынер па арганізацыі перавозак Наталля ПЕКУР**. — Працуем па заказах Магілёўхімвалакно, Магілёўліфтмаша, іншых прадпрыемстваў, ажыццяўляем перавозкі для індывідуальных прадпрымальнікаў. Нашы цягачы амаль увесь час у дарозе. Санкт-Пецярбург, Казань, Уфа, Ліпецк, Самара, Кемерава — геаграфія грузаперавозак шырокая.



Галоўны інжынер Мікалай ЛАПО упэўнены ў калектыве.

Не менш запатрабаваныя самазвалы аўтапарка. Паслугамі карыстаюцца дарожна-будаўнічыя арганізацыі, калгасы, лягсас, прадстаўнікі прыватнага бізнесу. Гэта танней, чым мець свой транспарт. Тым больш што аўтапарк — партнёр надзейны, абслужыць па найвышэйшым разрадзе.

Капейку ў агульную скарбонку прыносіць і іншая дзейнасць. З 2008 года на тэрыторыі аўтапарка функцыянуе станцыя дыягностыкі, узброеная па апошнім слове тэхнікі. З дапамогай сучаснага абсталявання спецыялісты робяць дыягностыку любога без выключэння аўто — легкавога, грузавога, цягача.

— Такіх універсальных станцый няшмат у Беларусі, — удакладняе **начальнік дыягнастычнай станцыі Сяргей ШЧАЦІНКА**. — Абсталяванне ў нас наўгародскай кампаніі «ГАРО». Тармазны стэнд дазваляе праверыць тармазы любых транспартных сродкаў, у тым ліку і з поўным прывадам.

Сяргей Міхайлавіч запрашае на міні-экскурсію па станцыі. Усюды спецыяльныя разметкі, відэакамеры. «Калі ўзнікаюць нейкія пытанні па абслугоўванні, заўсёды можна прагледзець, якія вузлы або агрэгаты дыягнаставалі», — каментуе начальнік станцыі. А яшчэ пільны відэанагляд — 9 відэакамер фіксуюць усё, што адбываецца на пляцоўцы, — дысцыплінуе саміх работнікаў. Тут кліента не праігнаруюць і дакладна не нахамяць.

Абсталяванне станцыі дазваляе не толькі зрабіць тэхагляд, тут праверыць усё, што можа выклікаць у аўтамабіліста няўпэўненасць, — тармазы, падвеску, дымнасць і CO. Не дзіўна, што некаторыя кліенты накіроўваюцца сюды нават з іншых абласцей. «Якасць і ўвага», — коратка фармулюе сакрэт поспеху Сяргей Шчацінка.

Для поўнага комплексу паслуг на тэрыторыі аўтапарка ёсць таксама сучасны шынамантаж і аўтамыйка. І тут таксама працуюць прафесіяналы. «У нас няма выпадковых людзей, кожны майстар сваёй справы, — запэўнівае **галоўны інжынер Мікалай ЛАПО**. — Тое, што кліент застанецца задаволены, гарантуем».

— Працоўны калектыў у нас правераны, трывалы, — згодны з ім дырэктар аўтапарка Сяргей Гапееў. — Хацеў бы падзякаваць усім работнікам за тое, што яны стараюцца і працуюць на вынік. А яшчэ вялікі дзякуй нашым партнёрам — ААТ «Магілёўхімвалакно», «Магілёўліфтмаш», будаўнічым арганізацыям, якія аддаюць нам перавагу і забяспечваюць працай.

УНП 700847187




Начальнік дыягнастычнай станцыі Сяргей ШЧАЦІНКА.

# СПРАВА ДЛЯ САПРАЎДНЫХ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

**Сёлета зіма для Бялыніцкага дарожна-рамонтнага будаўнічага ўпраўлення (ДРБУ) №170 была адносна спакойная — снегу выпала не шмат. Але калектыў увесь час быў, як той казаў, у баявой гатоўнасці. Дарожнікам не прывыкаць працаваць ноччу пры святле машынных фар. Ачыстка ад снегу, апрацоўка дарожнага палатна супрацьгалалёднымі матэрыяламі — гэта для іх звычайная справа ў зімовы час. Аўтамабільная траса павінна быць у парадку пры любых абставінах.**

Дарогі — візітоўка любога горада. Па іх складаецца ўражанне не толькі пра тых, хто імі займаецца, але і ў цэлым аб раёне. На дарогі Бялыніцкага раёна грэх скардзіцца. Хаця начальнік ДРБУ Алег Філіпаў усё роўна ставіцца да іх стану крытычна. Кажа сціпла: хацелася б, каб было лепш.

На ўзбраенні ўпраўлення 31 адзінка тэхнікі — ГАЗы, газелі, самазвалы, асфальтаўкладчыкі, каткі. І гэта без уліку дапаможнай тэхнікі. За ўласныя сродкі тут набываюцца неабходныя ў рабоце механізмы, навясное абсталяванне, паступова абнаўляецца машынны парк. Працаваць у рыначных умовах складана, але калектыў не сядзіць склаўшы рукі. Абслугоўванне мясцовай дарожнай сеткі — гэта толькі палова работы. Яшчэ 50% заказаў трэба шукаць. І тут прыходзіцца пільна сачыць за інфармацыяй у інтэрнэце, актыўна ўдзельнічаць у тэндарах. Быць запатрабаваным не проста, але гэта дысцыплінуе, прымушае рабіць сваю справу больш якасна. Летась, напрыклад, было шмат будаўнічых пляцовак у Магілёве. Займаліся добраўпарадкаваннем маладзёжнага мікрараёна «Спадарожнік», рабілі пляцоўкі для захавання сыравіны на заводзе палімерных труб. Заказчыкаў задавальняе якасць і кошт работ, а таксама тое, што яны выконваюцца ў агавораныя тэрміны.



Начальнік ДРБУ №170 Алег ФІЛІПАЎ.



Прыпынак сваімі рукамі.

— Будуем дарогі, укладваем асфальтабетон на розных аб'ектах Магілёўскай і Мінскай абласцей, выконваем увесь спектр дарожных паслуг, — расказвае Алег Філіпаў пра спецыфіку сваёй работы. — А яшчэ ўстанаўліваем прыпынačныя павільёны, лаўкі, дарожныя знакі. Лаўкі, дарэчы, робім самі, у нас для гэтага ёсць свой сталярны цэх. Эканомім таксама на рамонце тэхнікі, займаемся гэтым самі. Нават фарбуем, калі трэба. У нас па гэтай частцы ёсць нядрэнныя спецыялісты. Летам дапамагаем сельскагаспадарчым прадпрыемствам перавозіць на самазвалах ураджай.




Нават тэрыторыя ўпраўлення аформлена з густам.

Па выніках працы за мінулы год Бялыніцкае ДРБУ №170 увайшло ў тройку самых лепшых па выпрацоўцы на 1 работніка. Гэта сведчыць, што калектыў дзейнічаў зладжана, выконваў нарматывы прадукцыйнасці працы. Таму і сярэднямесячная зарплата ў мінулым годзе атрымалася на 7,1% большая, чым пазалетась.

Сёння запатрабавана выконваць поўны комплекс работ, і бялыніцкія дарожнікі імкнуцца адпавядаць запытам. Летась яны атрымалі сертыфікат, які дае магчымасць працаваць з бетоннай пліткай, устанаўліваць бардзюры.

— Час такі, што прыходзіцца займацца не толькі сваёй дарожнай справай, але і ўсім тым, што гарантуе грошы, — удакладняе начальнік. — Выконваем любыя віды работ, ад кладкі асфальту і тратуарнай пліткі да азелянення тэрыторый і высадкі дрэў.

У рабоце выкарыстоўваюцца ў асноўным свае ж матэрыялы. Арганізацыя мае свой кар'ер, дзе здабывае пясок і гравій. І невялікі асфальтабетонны завод, з дапамогай якога забяспечвае сябе галоўным будаўнічым матэрыялам.

У арганізацыі працуе ўсяго 54 чалавекі. Але, як кажа кіраўнік, для выканання пастаўленых перад імі задач людзей хапае. Працягласць мясцовай дарожнай сеткі, якую абслугоўвае калектыў, складае каля 505 кіламетраў. Выконваецца цэлы комплекс работ для падтрымання гэтых дарожных артэрый у жыццяздольным стане. На абслугоўванні таксама 22 масты працягласцю амаль 640 метраў.

Праца дарожніка не з лёгкіх, але адданых ёй людзей хапае. Работнікаў, якія прысвяцілі прадпрыемству больш за 15 гадоў, тут 12 чалавек. У чацвярых з іх стаж наогул складае 30 гадоў. Дарэчы, сам Алег Філіпаў працуе ў ДРБУ ўжо сёмы год. Прыйшоў сюды ў якасці галоўнага інжынера, а тры гады таму ўзначаліў арганізацыю. Сёлета ДРБУ прымала маладое папаўненне — двух выпускнікоў магілёўскага Беларуска-Расійскага ўніверсітэта. А наогул у калектыве працуе 14 чалавек ва ўзросце да 31 года.

Не забываюць тут і пра дабрачыннасць. Да кіраўніка падчас прамых ліній часта звяртаюцца жыхары вёсак па дапамогу. Дзесьці трэба прафіліроўку дарогі зрабіць, дзесьці ямачны рамонт. І тут не адмаўляюць, ідуць насустрач. А нядаўна ў якасці шэфскай дапамогі зрабілі рамонт дваровай тэрыторыі для сярэдняй школы №2 у Бялынічах. І зараз гэта яшчэ адзін з сімпатычных куточкаў горада.

УНП 700840537

Матэрыялы падрыхтавалі Нэлі ЗІГУЛЯ (*zigulya@zviazda.by*), Вольга ГЕЦЭВІЧ.
Фота Нэлі ЗІГУЛІ і з архіваў прадпрыемстваў.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение инв. №420/С-34179 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, наименование – здание корпуса цеха №10), общей площадью 1510,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 24В.<br>Составные части и принадлежности:<br>- благоустройство – пешеходная часть, площадью 429,8 кв. м;<br>- линия электропередачи (напряжением 0,4 кВ, марка кабеля ААБ 3*240), протяженность участка 200,6 м;<br>- водопроводная сеть (материал труб – чугун, d-100 мм), протяженностью 21,6 м;<br>- канализационная сеть: материал труб – чугун, d-100 мм, протяженность – 5,4 м; материал труб – керамика, d-150 мм, протяженность – 36,8 м;<br>- тепловая сеть: материал труб – сталь, 2d-32 мм, протяженностью 28 м |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 423650100007000809, площадью 0,1819 га (назначение – обслуживание производственной территории) по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 24В.<br>Примечания: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадью 0,0179 га; земли, находящиеся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений, код – 7, площадью 0,0851 га |
| Обременения со стороны 3 лиц | Капитальное строение, инв. №420/С-34179 является обеспечением исполнения обязательств по кредитному договору (залог). Условия проведения аукциона – ОАО «Белинвестбанк» выражает согласие на отчуждение капитального строения, инв. №420/С-34179 при условии направления полученных средств на полное погашение задолженности по кредитному договору № 31/2013к от 16.07.2013г. Право залога на вышеуказанное капитальное строение сохраняется за банком.<br>Министерством юстиции Республики Беларусь установлено ограничение на осуществление государственной регистрации сделок (снятие ограничений возможно при наличии информации об участнике – победителе аукциона) |
| Начальная цена продажи | 370 915,20 р. (триста семьдесят тысяч девятьсот пятнадцать рублей двадцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 18 545,76 р. (восемнадцать тысяч пятьсот сорок пять рублей семьдесят шесть копеек) |
| Продавец | ОАО «Лидская обувная фабрика», 231300, г. Лида, ул. Фабричная, 6, тел./факс (8 0154) 52-16-61 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | 100% предоплата в течение 30 календарных дней с момента снятия всех ограничений и заключения договора купли-продажи |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 29 марта 2017 г. в 12.00 по адресу: Гродненская область, г. Лида, ул. Фабричная, 6**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатор аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.09.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 24 марта 2017 г. до 15.00**

***Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: http://grodnoino.by/***

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение инв. № 420/С-26297 (назначение – здание механического цеха), общей площадью 1895,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 28Б. Составные части и принадлежности:<br>- благоустройство – пешеходная часть, площадью 587,7 кв. м;<br>- линия электропередачи (напряжением 0,4 кВ, марка кабеля АВВГ 3*185), протяженность кабеля 390,0 м, протяженность участка 182,1 м;<br>- водопроводная сеть (материал труб – чугун, d-100 мм);<br>- канализационная сеть: трубопровод безнапорный (материал труб – чугун, d-100 мм), трубопровод безнапорный (материал труб – керамика, d-150 мм);<br>- тепловая сеть: участок сети от УЗ-1 до УЗ-2 (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-125 мм), участок сети от УЗ-2 до УЗ-3 (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-100 мм), участок сети от УЗ-3 до УЗ-4 (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-50 мм), участок сети от УЗ-4 до УЗ-5 (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-76 мм), участок сети от УЗ-4 до ввода в здание (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-76 мм), участок сети от УЗ-5 до ввода в здание (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-40 мм) |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 423650100007000814, площадью 0,3489 га (назначение – обслуживание производственной территории) по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 28Б.<br>Примечания: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадью 0,0175 га; земли, находящиеся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений, код – 7, площадью 0,2750 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий связи и радиофикации, код – 5, площадью 0,0074 га |
| Обременения со стороны третьих лиц | Договор об ипотеке №№1и–13 от 31.01.2013 г. между ОАО «Лидская обувная фабрика» и ЗАО «Банк ВТБ» (Беларусь) Региональная дирекция №400, договора аренды: помещение площадью 89,6 кв. м – до 01.09.2017 г.<br>- Министерством юстиции Республики Беларусь установлено ограничение на осуществление государственной регистрации сделок (снятие ограничений возможно при наличии информации об участнике – победителе аукциона) |
| Начальная цена продажи | 552 547,20 р. (пятьсот пятьдесят две тысячи пятьсот сорок семь рублей двадцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 55 254,72 р. (пятьдесят пять тысяч двести пятьдесят четыре рубля семьдесят две копейки) |
| Продавец | ОАО «Лидская обувная фабрика», 231300, г. Лида, ул. Фабричная, 6, тел./факс (8 0154) 52-16-61 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | 100% предоплата в течение 20 календарных дней с момента снятия всех ограничений и заключения договора купли-продажи |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 29 марта 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 13.07.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 24 марта 2017 г. до 15.00**

***Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: http://grodnoino.by/***

## ОАО «Опытный завод металлоконструкций»

проводит очередное общее собрание акционеров по адресу: г. Минск, пр. Пушкина, 68, зал заседаний.

Дата проведения собрания: **24 марта 2017 года**, начало – 15 часов 30 минут.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2016 году и основных направлениях деятельности на 2017 год.
2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе за 2016 год.
3. Отчет о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества ревизионной комиссией за 2016 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества.
5. Утверждение распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2016 год. О выплате дивидендов за 2016 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества на 2017 год. Периодичность выплаты дивидендов за 2017 год.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О расходах, направляемых на оказание безвозмездной (спонсорской) помощи в 2017 году.
9. О внесении изменений в Устав Общества. Увеличение Уставного фонда путем увеличения стоимости акций.
10. Выполнение управляющей организацией ООО «КверкСтройИнвест» условий договора №1 от 21 января 2016 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Справки по телефону 204 30 72.

УНП 100135691.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, обращенного в доход государства по поручению Бобруйского межрайонного отдела Управления по Могилевской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь**

ЛОТ №1: **капитальное строение с инв. №710/С-10661 – жилой дом 92**, назначение – жилой дом; составные части и принадлежности: жилой дом с двумя пристройками, сенями, четырьмя сараями, баней, двумя гаражами, уборной. Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Жуковского, 92. Общ. пл. 91 кв. м, фундамент дома – кирпичный, стены – бревенчатые, перекрытия – деревянные, подшиты; кровля – шиферная, полы – дощатые, окна – деревянные одинарные, двери – филенчатые, электроснабжение, отопление – печное.

Сведения о земельном участке: дом расположен на земельном участке (право пожизненного наследуемого владения) с кадастровым номером 741000000008000989, расположенном по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Жуковского, 92, площадь 0,1216 га.

**Начальная цена продажи 24 980,40 белорусского рубля.**
**Сумма задатка 2 498,04 бел. руб.**

| | |
|---|---|
| Расчетный счет для перечисления задатка | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», МФО 153001369 |
| Дата, время и место проведения аукциона | **Аукцион проводится 30 марта 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 99, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 29 марта 2017 года до 15.00 |
| Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона |
| Информация о предыдущем аукционе была размещена в номере газеты «Звязда» 24.01.2017 | |

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; (8 029) 624-26-25**

Уважаемые акционеры

## ОАО «МАПИД»

**29 марта 2017 года** состоится очередное общее собрание акционеров **ОАО «МАПИД»,** расположенного по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205. Собрание созывается по инициативе Наблюдательного совета ОАО «МАПИД».

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 130 (пристройка к общежитию ОАО «МАПИД»)

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2016 году и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.
2. О работе Наблюдательного совета в 2016 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2016 год.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2016 год. О выплате дивидендов за 2016 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2017 год и первый квартал 2018 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2017 году.
7. О внесении изменений в Устав Общества.
8. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 9.00 до 16.00 по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. №208А (отдел собственного строительства и инвестиций), в день проведения собрания – с 13.00 до 14.30 по месту его проведения в период:

- с 09.03.2017 по 28.03.2017 – ознакомление с информацией о деятельности Общества за 2016 год и основных направлениях деятельности на 2017 год;
- с 22.03.2017 по 28.03.2017 – ознакомление с иными материалами по вопросам повестки дня общего собрания.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 14.30 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 29 марта 2017 года, 15.00.**

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 9 марта 2017 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
акционеру общества – паспорт;
представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100008115 **Администрация**

■ Узровень-40

# ПЕСНІ — ВЕХІ НАШАГА ЮНАЦТВА

**...У маршрутцы, вагоне метро, калі прыглядзецца, заўсёды як мінімум палова пасажыраў сядзяць, уткнуўшыся ў свае гаджэты. Многія слухаюць музыку, часам падзяліўшыся другім навушнікам з сябрам ці сяброўкай. Назіраючы за гэтым, я амаль кожны раз прыгадваю музыкальныя «гаджэты» сваіх юнацтва і маладосці, песні, якія мы некалі слухалі. Як імкліва ўсё змянілася з тых часоў! Вось уявіце сабе, хто маладзейшы: па вялікім рахунку, мне не так ужо і шмат гадоў, а я паспеў пакруціць ручку патэфона, пачуць трэск лямпавай радыёлы, шыпенне такога жаданага некалі партатыўнага радыёпрыёмніка, алоўкам паперамотваць касеты для магнітафона (ці ведаеце, як гэта рабілася і для чаго?), пазайздросціць тым, хто першым абзавёўся тым самым касетнікам, а потым і плэерам... Асобна пра тое, што мы слухалі, што, без перабольшання, стала пэўнымі вехамі ў нашым жыцці. Але пра гэта — літаральна пункцірам, бо варта толькі пачаць прыгадваць імёны выканаўцаў, назвы гуртоў, перыяд часу і ўсё, што з ім было звязана асабіста, як працэс рызыкуе стаць бесперапынным.**

ПАТЭФОН памятаю добра: яго аддала цётка, ён і зараз недзе на гарышчы ў бацькоўскай хаце. А вось песні, якія на ім слухалі, — не. Пласцінак было некалькі, праблемай было знайсці іголкі. Больш помніцца радыёла (ці ведае маладое пакаленне, што гэта?). Малым дзіцем чамусьці бясконца любіў слухаць дзве песні: «Опять по шпалам, опять по шпалам иду домой по привычке» і «Лада — для меня твой смех награда, даже если станешь бабушкой, все равно ты будешь Ладушкой». Дарэчы, вялікіх канцэртаў па тэлебачанні, у адрозненне ад цяперашняга часу, раней было няшмат. Мабыць, таму іх і глядзелі з задавальненнем нашы бацькі. «Издалека долго течёт река Волга...» Самым запамінальным для мяне быў канцэрт да Дня міліцыі, бо ў другой яго палове традыцыйна выступалі гумарысты.



**Тэма размоў на паўдня была адна: «А вы бачылі, як Наташка спела «Жоўтыя цюльпаны»? Заўважце, не «чулі», а «бачылі».**

...«Не пеняйте на меня, я уйду из стада!». Уладзіміра Высоцкага на той момант ужо, мабыць, не было на гэтым свеце, пра што я мог яшчэ і не ведаць. Як акцёр, найперш, як капітан Жаглоў, ён быў для мяне жывейшы за жывых. Мы гулялі ў футбол, і нехта са старэйшых хлопцаў праз узмацняльнік даў на калонкі гук на поўную магутнасць. Я ганяў мяч і не мог уцяміць аднаго: як такі сур'ёзны і любімы артыст можа спяваць такія легкадумныя песні? Філасофскі падтэкст быццам бы жартаўлівых кампазіцый я зразумеў і ацаніў праз нейкі час, гэтак жа, як і адкрыў для сябе шматлікія цыклы песень Высоцкага на розныя тэмы. «Парус, порвали парус...» Гэта было пазней і засталося на ўсё жыццё, але ж першае знаёмства з гэтай гранню таленту Уладзіміра Сямёнавіча адбылося менавіта тады, на імправізаваным футбольным полі.



МУЗЫЧНЫХ перадач раней таксама было не так шмат, дакладней, лічаныя адзінкі. У 1980-х — пачатку 1990-х на саюзным тэлебачанні папулярнай была тэлеперадача «Ранішняя пошта», на беларускім — «Сустрэнемся пасля адзінаццаці». Іх чакалі, каб не толькі паслухаць песні, але і запісаць на магнітафон (у каго ён быў) музычныя навінкі. Заходжу неяк да стрыечнага брата, равесніка, а ён у такіх велізарных навушніках сядзіць каля велізарнага бабінніка (раскоша!) сваіх старэйшых братоў. Гэта з таго часу гучыць у вушах Антонаў са сваім «Маки, маки, алые маки, светлая память земли, неужели вам снятся атаки...» ці Нікалаеў — пра стары млын, каля якога «бьётся о камни вода, все перемелется, только любовь — никогда...» На гэтых самых бабінах можна было паслухаць і забароненыя песні. Напрыклад, вядомага зараз зусім не музычнымі кампазіцыямі Лазу — «Девочка сегодня в баре, девочке 16 лет...»

Пад «Сустрэнемся пасля адзінаццаці» мы падпявалі Паплаўскай і Ціхановічу: «Завіруха», «Я у бабушки живу», «Малиновка»... Неяк у школе выразаў з лістка са сшытка славутыя мулявінскія вусы, падчапіў сабе пад нос і завёў, фальшывячы на ўсе сто: «Ты нясі, мяне нясі, конь незацу-гля-ны...» Сябра літаральна споўз на падлогу. Яшчэ майму школьнаму таварышу вельмі падабалася і прыводзіла ў захапленне, калі я пачынаў выводзіць танюткім голасам: «Вой, Калядачкі — бліны-ладачкі... Каляда, ага-ага-ага, Ка-ля-д-а-а-а!..»

**...«Дитер — болен, Дитер — болен!» Ён паўтараў гэтую фразу няспынна, зноў і зноў, упіваючыся значнасцю ўласнага адкрыцця.**

ВЫ памятаеце, пад якую песню ўпершыню запрасілі на танец дзяўчыну? У мяне гэта была «Лаванда» Сафіі Ратару. І вось што дзіўна. Прайшло ўжо страшна сказаць колькі гадоў з таго моманту, у мяне паспела пасівець барада, а спявачка быццам толькі маладзее!.. «Лаванда, горная лаванда, наших встреч с тобой синие цветы... Столько лет прошло, но помним я и ты...»

У продажы пачалі з'яўляцца першыя айчынныя пераносныя касетныя магнітафоны, якія сілкаваліся ад батарэек. Ты быў крутым, калі ішоў з ім у руках па вуліцы! Касеты можна было знайсці з запісамі, але большасці гатовыя падборкі не падабаліся. «Добрым тонам» лічылася скласці альбом на свой капыл, чаргуючы выканаўцаў і стылі. Для гэтага патрэбны былі касета-зыходнік з упадабанымі запісамі, касета для запісу і другі магнітафон. Таму прадметам зайздрасці былі двухкасетнікі, як правіла, імпартныя. Касеты таксама даводзілася шукаць. Айчынныя былі не заўсёды добрай якасці, а кошт імпартнай, напрыклад, вытворчасці BASF з працягласцю гучання 90 хвілін складаў у «фарцоўшчыкаў» 10 рублёў. Першыя мае студэнцкія стыпендыі праз некалькі гадоў (!) раўняліся менавіта такой суме. Але яно таго каштавала, гэта было выгаднае «капіталаўкладанне». Дарэчы, многія, каб захаваць вельмі каштоўны для ўладальніка запіс ад выпадковага сцірання, выломлівалі на канцы касеты спецыяльныя пластыкавыя засцерагальнікі.

**І завёў, фальшывячы на ўсе сто: «Ты нясі, мяне нясі, конь незацу-гля-ны...» Сябра літаральна споўз на падлогу.**

...«Дитер — болен, Дитер — болен!» У лесе, дзе наша вулічная кампанія збірала грыбы, не змаўкаў голас і смех Колькі. Ён паўтараў гэтую фразу няспынна, зноў і зноў, упіваючыся значнасцю ўласнага адкрыцця. Здагадаліся, якія часы надышлі? А разам з імі на тэлеэкранах з'явіліся і папулярныя тады зоркі сучаснай замежнай эстрады, сярод якіх «Модэрн Токінг» з Дзітэрам Боленам і Томасам Андэрсам былі, мабыць, на першым месцы. Равеснікі, памятаеце групу «Еўропа»? А яе славуты пройгрыш у адной з песні? Упэўнены, ноччу вас разбудзі — праспяваеце.

УПРОЦІВАГУ савецкім песням і папсовым мелодыям замежжа неяк нечакана загучалі кампазіцыі, якія вельмі адрозніваліся ад чутага раней. У 1987 годзе такой песняй стала «Група крови на рукаве» гурта «Кино». Праз год быў зняты фільм «Игла», дзе яна гучала ў фінале стужкі. Не ўпэўнены, што большасць маіх равеснікаў разумела рэжысёрскую задумку, хутчэй, у кіно ішлі «на Цоя». Недзе ў глыбіні душы было няяснае адчуванне пратэсту, свабоды, разумення, як сказаў бы зараз, што чалавек можа быць шчаслівым не толькі дзякуючы камуністычным ідэалам... «Но если есть в кармане пачка сигарет, значит, все не так уж плохо на сегодняшний день...» Нядаўні ўзнёслы пафас патрыятычных песень замянілі пратэстныя «Алюминиевые огурцы».

ДАКЛАДНА памятаю, калі ўпершыню Каралёва спела свае славутыя «Жоўтыя цюльпаны». І вось дзякуючы якой гісторыі. Я заканчваў вучылішча, быў час практыкі — сакавік-красавік. Я праходзіў яе на адной з меліярацыйных помпавых станцый. І вось аднойчы ў панядзелак на нашу «Сігму-2» увальваецца з паўтузіна маіх старэйшых часовых калег. У кожнага вочы — па сподачку, голас — дрыжыць. Тэма размоў на паўдня была адна: «А вы бачылі, як Наташка спела «Жоўтыя цюльпаны»? Заўважце, не «чулі», а «бачылі». Вядомая рэч, на выхадныя ў «Ранішняй пошце» быў дэбют песні. Ну, хто памятае Каралёву ў маладосці, здагадваецца, пра што я. «О-у-о-у, желтые тюльпаны...» Дагэтуль смешна прыгадваць дзецюкоў пасля армейскай службы, якія паводзілі сябе, як той Колька, адкрыўшы, што «Дитер — болен»...

**Я ганяў мяч і не мог уцяміць аднаго: як такі сур'ёзны і любімы артыст можа спяваць такія легкадумныя песні?**

Мянялася жыццё, а разам з ім — і эпоха. Часам так, як мы і меркаваць не маглі... Пра забойства Ігара Талькова я даведаўся ранкам, калі ехаў з пасёлка ў сталіцу на вучобу. Памятаю, у аўтобусе з-за расчыненых дзвярэй было вельмі холадна, на будынку аўтастанцыі цьмяна гарэла лямпачка... Бабулі-пасажыркі спалоханым паўшэптам абмяркоўвалі трагічную навіну і ледзь не плакалі... «Я пророчить не берусь, но точно знаю, что вернусь... в страну не дураков, но гениев...» Насуперак назве песні, ён не вярнуўся. А зусім хутка не стала і той краіны...




ПАД «Дым сигарет с ментолом» у вушах я цёмным вечарам спяшаўся на танцы ў Дом культуры. Не быў на іх некалькі выхадных. Доўга прыводзіў сябе ў парадак, таму не хацеў спазняцца на сустрэчу з сябрамі, якія, дарэчы, і не ведалі, што я ў пасёлку. А толькі адну галаву давялося мыць тройчы, бо вада кожны раз была чорная. У гэты дзень я, як і мае аднакурснікі па журфаку, вярнуліся дадому «з бульбы». Прабылі мы на ёй тыдні паўтара-два, а потым развярнуліся і з'ехалі. Кіраўніцтва гаспадаркі ў Лагойскім раёне нас не спыняла. Ды і чым магло, калі мы фактычна былі кінутыя сам-насам у той вёсачцы? Працавалі ў тым ліку на камбайнах на тарфяніках, а сродкаў абароны — ніякіх. Мне, напрыклад, бруд патрапіў у вока, яно запалілася, некалькі дзён хадзіў як той пірат — з павязкай на твары. Лазні таксама не было, прычоска нагадвала індзейскі іракез. Было і яшчэ мноства нейкіх бытавых праблем, якія кіраўніцтва калгаса вырашаць не спяшалася. Ну, мы крыху пацярпелі, а потым сабраліся і з'ехалі. Дарэчы, за той учынак нам, студэнтам-другакурснікам, нічога не было. Мы пра тое яшчэ не ведалі, але сумленне ў нас было чыстым. «Нажми на кнопку — получишь результат и твоя мечта осуществится...» Я спяшаўся на танцы. Але гэта — ужо зусім іншая гісторыя...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Валянцінкай

## «... І НЕ ДАЖЫЦЬ ДА КАХАННЯ СВАЙГО»

**У слова *трыпціх*, паводле тлумачальнага слоўніка, значэнняў тры: гэта ікона-складзень, тры вершы альбо тры карціны (малюнкі), аб'яднаныя агульнай тэмай.**

Тады гэта — малюнак першы, пра шлюб, якога не было. Сапраўды, хлопец з дзеўкай толькі збіраліся пажаніцца, але ўжо сказалі пра гэта бацькам. Тыя, як вядзецца, сустрэліся, нечага выпілі, спланавалі вяселле.

Маладым заставалася хіба чакаць, пакрысе рыхтавацца ды па-ранейшаму сустракацца. Найчасцей — на нейтральнай тэрыторыі. Але ж зрэдку — дома ў нарачонай.

Вось і ў той раз жаніх прыйшоў. Нявеста пачаставаць хацела. І не проста кавай-гарбатай, а «па-даросламу» — яечняй.

Каб падсмажыць, пайшла ў кухню. Хлопец застаўся ў зале, але ж хутка засумаваў і рушыў за ёю следам. Навошта? Ніхто не ведае. Можа, думаў побач пастаяць ды палюбавацца ёю, можа, дапамагчы... Бо «працэс» там ва ўсю ішоў: гаспадынька яечкі біла — аб край патэльні.

— Ну хто ж так робіць? — спытаў у яе жаніх. І тут жа паказаў, як трэба: гэта значыць, адсунуў дзяўчыну ад пліты, разбіў яечка нажом ды яшчэ і жаўток «парваў», каб лепей прапёкся...

Думаў, што яму зараз дзякуй скажуць.

Ды не на тую нарваўся: яго нявеста якраз наадварот зрабіла — дзверы адчыніла і папрасіла... вон.

Потым матулі прызналася, што ніколі не пацерпіць, каб мужчына ў жаночыя справы лез, каб вучыў, як яечню смажыць... І, адпаведна, адмовіла таму «настаўніку»: замуж за яго не пайшла.

Іншая дзеўка (гэта малюнак другі) замуж «схадзіла» была.

Са сваім яна распісалася ў суботу бліжэй да вечара, потым, хоць сціпла, але ж падзею гэту адзначылі і першую ноч правялі. А раніцай — прачнуліся. Жонка, як заведзена ў большасці знаёмых сем'яў, першай устала з ложка, пайшла ў кухню сняданак гатаваць. Недзе праз паўгадзінкі (мо трохі больш) туды ж, на пах падсмажанай бульбы, «падцягнуўся» муж. Сказаў ёй:

— Накрыўку ў патэльні знімі.

— Гэта ж навошта? — папыталася жонка.

— Бульбу пад накрыўкай ніхто не смажыць.

— Як гэта ніхто? Мая мама — усё жыццё!

— Твая мама нічога не разумее... І ў смажанай бульбе таксама.

— Затое твая...

Слова за слова, карацей, у выніку дагаварыліся да таго, што муж, ляпнуўшы дзвярыма, выскачыў з хаты. І даганяць яго жонка не пабегла.

А праз нейкі час падала на развод.

...Трэцяя дзяўчына пра дзвюх першых чула і думала, што яна вось гэткай дурніцай аніколі не будзе, што ў яе хопіць розуму не лезці ў «бутэльку» з-за нейкага там курынага яйка (як муж скажа, так і разаб'е — аб край дык аб край, нажом дык нажом — падумаеш...), што яна зніме з патэльні накрыўку, падсмажыць бульбу так, як захоча нехта...

Яна выйшла замуж, прычым досыць рана. Яна жыве ў шлюбе і — калі знешне — дык нават добра. Але...

Кожны раз, гучна прамаўляючы мужава імя (клічучы яго да тэлефона, да стала альбо на дапамогу), не пазнае свой жа голас, не верыць сама сабе: нутром чуе, што гэта — не яе чалавек, што ў таго — усё іншае: імя, аблічча, голас, характар...

Караткевіч пісаў, што
*Лепей вісець на нажы,*
*Кахаць,*
*Праклінаць за каханне багоў,*
*Чым век пражыць і дзяцей нажыць*
*І не дажыць да кахання свайго.*

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*



## Пантэон Айчыны



### МІНДОЎГ (? — 1263)

Вакол яго асобы вядуцца зацятыя спрэчкі гісторыкаў. Сціплыя звесткі, што захаваліся пра яго жыццё, спарадзілі шмат версій, а то і фальсіфікацый. Яго абвяшчалі стваральнікам Вялікага Княства Літоўскага, які нібыта заваяваў заходнія землі Беларусі і такім чынам усталяваў на іх уладарства «літоўскіх феадалаў». Але ніводны гістарычны дакумент не сведчыць аб гэтым. Больш за тое, невядома, дзе жыў Міндоўг і што ўвогуле азначае яго імя, да якой мовы яно належыць. Так што залічаць яго да летувісаў у нас няма ніякіх падстаў. Дзіўна, але пра Міндоўга толькі ў беларусаў захаваліся паданні, дзе ён называецца навагрудскім князем. У самім Навагрудку ёсць курган Міндоўга, які нібыта насыпалі навагрудцы над магілай свайго князя. Курган і вуліцы Міндоўга былі ў мінулым у Пінску. Народная памяць зберагла факт пражывання князя ў Навагрудку. Напэўна, радавым гняздом Міндоўга быў град Рута, які ўпамінаецца ў летапісе. Некалькі населеных пунктаў з назвай Рута ёсць паблізу Навагрудка, там жа працякае рака з такой назвай. Супадзенне гэтых даных не можа быць выпадковым.

Больш блізкім да ісціны ўяўляецца нам даследаванне гісторыка Міколы Ермаловіча. Прааналізаваўшы звесткі летапісаў, ён прыйшоў да высновы, што старажытная Літва знаходзілася ў Верхнім Панямонні, паміж Менскам і Навагрудкам, Пінскам і Крэвам. Пра Літву ў гэтым рэгіёне пісаў і польскі гісторык Мацей Страйкоўскі, які адзначаў, што яна «здаўна прыслугоўвала Навагрудскаму княству». Дык вось, магчыма, Міндоўг і быў князем гэтай Літвы і знаходзіўся ў васальнай залежнасці ад навагрудскага князя Ізяслава. Прамых звестак, як трапіў Міндоўг у Навагрудак і стаў тым князем, няма. Верагодна, зазнаў паражэнне ў міжусобнай барацьбе з іншымі літоўскімі феадаламі, ён уцёк у Навагрудак, прыняў праваслаўе і быў выбраны князем. З навагрудскай дружынай Міндоўг дзесьці на пачатку 50-х гадоў XIII стагоддзя заваяваў «усю зямлю Літоўскую». Магло быць інакш, але так ці інакш Навагрудская зямля знаходзілася пад уладай Міндоўга.

> **Папа ўзрадаваўся, што Міндоўг «спазнаў хвалу Божую і праз хрышчэнне адрадзіўся», і прыслаў яму булу, якой абвяшчаў, што «...Каралеўства літоўскае прымае пад пратэкцыю апостальскай сталіцы».**

Здрадніцкія забойствы, хітрасць, падман — ні перад чым не спыняўся Міндоўг, каб падначаліць Літву. Той, хто станавіўся на яго шляху, быў забіты альбо вымушаны падзяліць лёс ізгояў. Уцекачы знайшлі падтрымку ў галіцка-валынскага князя Данілы. Яму ўдалося стварыць кааліцыю з Галіцка-Валынскага княства, Яцвязі, Жамойціі і Лівонскага ордэна. І пачалася вайна. Каб раз'яднаць кааліцыю, Міндоўг пайшоў на хітры палітычны крок. Ён падкупіў лівонскага магістра Андрэя Сціրланда і абяцаў яму прыняць каталіцтва, а ў дар ордэну адпісаць некаторыя землі. У сваю чаргу, магістр паабяцаў выпрасіць у Папы Рымскага для Міндоўга каралеўскую карону. Гэтак і адбылося. Папа ўзрадаваўся, што Міндоўг «спазнаў хвалу Божую і праз хрышчэнне адрадзіўся», і прыслаў яму булу, якой абвяшчаў, што «...Каралеўства літоўскае прымае пад пратэкцыю апостальскай сталіцы». У 1253 годзе Міндоўг каранаваўся ў Навагрудку на караля літоўскага. Як і абяцаў, Міндоўг хрысціўся са сваімі баярамі і адпісаў ордэну тое, што не належала яму — Яцвязь, Жамойцію, Дайнову (зямлю паміж Нёманам і вярхоўем ракі Нараў), Нальшаны (зямля ў раёне сучасных Гальшанаў, Ашмянаў, Крэва). Такім чынам, Лівонскі ордэн стаў саюзнікам Міндоўга. Аднак Міндоўг не перамог у вайне. Даніла Галіцкі «плениша всю землю Новогородьскую». Давялося Міндоўгу прасіць міру. Яго сын Войшалк і заключыў гэты мір, саступіўшы Данілу Навагрудак, Слонім і Ваўкавыск. Невядома, у якім горадзе правіў пасля гэтага Міндоўг. Становішча яго было хісткае. Паганскае насельніцтва Літвы было незадаволена сваім уладаром-хрысціянінам, таму ён паказваў, што яго хрышчэнне «льстиво». Усё больш і больш падпадае ён пад уплыў жамойцкага князя Траняты, які настойваў на вяртанні яго ў паганства.

> **Прамых звестак, як трапіў Міндоўг у Навагрудак і стаў тым князем, няма. Верагодна, зазнаў паражэнне ў міжусобнай барацьбе з іншымі літоўскімі феадаламі, ён уцёк у Навагрудак, прыняў праваслаўе і быў выбраны князем.**

Транята і падбіў Міндоўга на паход у Латгалію і Лівонію: маўляў, абедзве гэтыя землі трапяць у яго рукі, бо яны хочуць зрабіцца паганцамі. Міндоўг, спакусіўшыся на шчодрыя абяцанні, парывае з ордэнам і адракаецца ад хрысціянства. Транята выкарыстаў Літву ў вайне з ордэнам і вырашыў сам стаць каралём літоўскім. У 1261 годзе Міндоўг з войскам прыйшоў у Лівонію. Транята здрадзіў яму і ўвёў жамойцаў. Ні лівы, ні латгалы не паўсталі супраць ордэна. Нарэшце Міндоўг зразумеў, што Транята выкарыстаў яго ў сваіх палітычных планах. Міндоўг мусіў змірыцца са сваім становішчам. «Што будзе, тое будзе, я прытрымаюся ўказанняў Траняты і жамойтаў». А Транята чакаў свайго часу. У 1262 годзе ў Міндоўга памерла жонка, тады ён сілай бярэ сабе яе сястру, жонку нальшанскага князя Даўмонта. Транята ўцягнуў Даўмонта ў сваю змову. Каб пазбавіцца ад іх, Міндоўг у 1263 годзе адправіў абодвух у паход на Бранск. Але яны перахітрылі Міндоўга. Даўмонт вярнуўся назад і ноччу напаў на дом літоўскага ўладара, забіў яго разам з двума сынамі. Так закончылася жыццё першага і апошняга караля літоўскага. Тое, што не змог зрабіць ён, зрабіў яго сын Войшалк.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Практычнае радзімазнаўства

# Калі замак... турма

## 160 гадоў таму ў Вілейцы была асвечана першая каменная пабудова

**Да гэтага часу сярод многіх віляйчан бытуе прыгожая легенда, што пасля таго, як у 1795 годзе па ўказе расійскай імператрыцы Кацярыны ІІ Вілейка стала павятовым горадам, то неўзабаве яна прыехала сюды, пасадзіла першае дрэўца ў гарадскім парку і залажыла першы камень у падмурак будучага астрога. На самай справе абставіны ўзвядзення гэтага архітэктурнага збудавання зусім іншыя. 30 ліпеня 1846 года імператар Мікалай І зацвердзіў праект будаўніцтва турэмных замкаў у павятовых гарадах на 100 арыштантаў. 2 лютага 1848 года ў Віленскай губерні нават быў устаноўлены асобы земскі збор на 12 гадоў на ўладкаванне будынкаў дзяржаўных устаноў і турмаў.**



Неабходнасць пабудовы новай турмы ў Вілейцы была абумоўлена яшчэ і тым, што стары драўляны будынак астрога прыйшоў у аварыйны стан, не паддаваўся ўжо рамонту і не мог забяспечыць надзейную ахову сядзельцаў.

Быў зроблены праект на будаўніцтва і складзены каштарыс на 49 610 рублёў 17 капеек серабром. Пазней гэту суму зменшылі да 45 232 рублёў 83 капеек. Месца для новай турмы абрана на той момант зручнае, высокі пагорак на заходнім ускраіне горада, былой Нарочкай вуліцы (цяпер — вуліца 1 Мая). Пабудова мураванага турэмнага замка пачалася 16 красавіка 1854 года і ішла на працягу трох летніх перыядаў.

Вядзенне будоўлі было аддадзена з таргоў у аптовы падрад віленскаму 1-й гільдыі купцу Хаіму Англіну. Праз год ён памёр, і закончыць работы мусіла залогадавальніца, паверанай калежская саветніца Юзэфа Шкульцецкая. Яна з гонарам выканала ўскладзеную на яе місію, і 1 кастрычніка 1856 года будаўніцтва турэмнага замка завяршылася.

Але перш, чым засяляць арыштантаў, вырашылі асвяціць новы будынак. І адбылося гэта 15 (27) студзеня 1857 года. Хутка ў астрозе з'явіліся і першыя арыштанты.

Прыгожы двухпавярховы будынак з дзвюма вежамі па краях, акружаны каменнай сцяной, уяўляў цэласны архітэктурны ансамбль. На турэмнай тэрыторыі размяшчаліся кватэра наглядчыка, лазня, лядоўня. У падвальных памяшканнях астрога знаходзіліся пральня, гаўптвахта, кватэра вартаўнікоў, кладоўкі, ванна, кухня, пякарня, пакой для прыёму арыштантаў. На першым паверсе месцілася шэсць адзіночных камер, восем камер для зняволеных па судовым прыгаворы малаважных злачынцаў з дваран і простых людзей, перасыльных арыштантаў, а таксама лазарэт. На другім паверсе размяшчаліся ідэнтычныя першаму паверху камеры для арыштантаў жаночага полу, лазарэт і аптэка.

У пачатку чэрвеня 1857 года ў Вілейку па рацэ Вілія прыплыла навуковая экспедыцыя. Вось як занатаваў свае першыя ўражанні яе кіраўнік граф Канстанцін Тышкевіч: «*...Пасля гандлёвых — людных і шумных прыстаняў, пачынаецца іншая Вілія: самотная, панурая, з нізкімі пустэльнымі берагамі. Нечакана па-над берагавой лініяй, на ўзгорку з'яўляецца нейкі белы аб'ект, які з гэтага моманту ўжо не знікае з нашых вачэй, пакуль мы мяняем напрамак. І чым бліжэй мы падплываем, тым ясней бачым, што белая кропка — гэта новая пабудаваная вілейская турма, адзіная мураваная пабудова ў гэтым горадзе*».

У 1964 годзе турма ў Вілейцы перастала існаваць, у будынку, пасля нядоўгага рамонту, размясціўся анкалагічны дыспансер.

За сваю 100-гадовую гісторыю праз змрочныя казематы вілейскай турмы прайшлі сотні тысяч падследных і зняволеных, тут разыграліся чалавечыя драмы і трагедыі. За ўсю гісторыю турма бачыла нямала і вядомых асоб. Паэты Валянцін Таўлай, Алесь Дубровіч, Андрэй Капуцкі, Ганна Новік адбывалі тут розныя тэрміны пакарання за актыўны ўдзел у падпольным руху Заходняй Беларусі. Менавіта тут, у турэмных сценах, В. Таўлай пачаў пісаць паэму «Мы аптымісты».

Сумны і трагічны след пакінуў у нашай гісторыі перыяд сталінскага таталітарнага рэжыму. Адразу ж пасля ўступлення Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь пачаліся палітычныя рэпрэсіі ў адносінах да «контррэвалюцыйных, антысавецкіх, нацыяналістычных элементаў». Турэмных камер не хапала, і зняволеных размяшчалі проста ў двары. 6 кастрычніка 1939 года быў арыштаваны і 13 жудасных месяцаў правёў у вілейскай турме Аляксандр Уласаў, першы рэдактар першай беларускай газеты «Наша Ніва», а таксама «Сахі», «Лучынкі» і іншых выданняў.

Далей свае крывавыя і больш маштабныя справы працягвалі нацысты. Турэмны двор стаў месцам масавага знішчэння ваеннапалонных, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў. Па падазрэнні ў сувязі з партызанамі два тыдні ў вілейскай турме правёў Барыс Кіт — сусветна вядомы вучоны. Ён быў сведкам, як кожны дзень гітлераўцы вывозілі на расстрэл вязняў турмы.

Сёння цяжка канстатаваць і рабіць канчатковы вывад, ахвярамі чыіх рук сталі ў розныя гады, часам ні ў чым не вінаватыя вязні вілейскай турмы, для многіх з якіх турэмны двор стаў апошнім жыццёвым прытулкам.

У 1995 годзе на гарадскіх могілках «Лясныя», непадалёку ад увахода, устаноўлены вялікі драўляны крыж, а побач — валун, на якім высечаны словы: «Ратуй нас, Хрысце, лёсу пакутнікаў, замучаных і расстраляных у турме вілейскай за час існавання яе. Дабраслаў, Божа, душы палеглых айцоў, братоў і сясцёр нашых, імён якіх пакуль не ведаем».

Гэтым, напэўна, пастаўлена апошняя кропка ў гісторыі вілейскай турмы.

**Вольга КОЛАСАВА** ■

# НАПЕРАД, У МІНУЛАЕ

## Да турыстычнага сезона ў Гродне з'явяцца шыльды з гістарычнымі назвамі вуліц на беларускай мове

Тапанімічнай камісіяй для гэтай мэты абрана 16 вуліц у старым горадзе, якія раней мелі іншыя назвы. Як расказаў «Звяздзе» **член камісіі, загадчык аддзела Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Андрэй ВАШКЕВІЧ**, некаторыя з іх змянялі шыльды па некалькі разоў. Напрыклад, сённяшняя Сацыялістычная ў розныя часы называлася Татарскай, Гарохавай, Банкавай. Была яна яшчэ і Басняцкай, бо тут жылі паліцэйскія, якіх прывозілі з Босніі, а яшчэ раней гэта вуліца называлася імем Вітаўта, вялікага князя ВКЛ. Сучасная вуліца Свярдлова некалі называлася Курганнай. Ёсць звесткі, што тут высіўся курган, які быў зруйнаваны падчас будаўніцтва чыгункі. Цікава, што ў Гродне ў 20-я гады была нават вуліца, якая насіла імя амерыканскага прэзідэнта Гувера, з якім звязана гуманітарная дапамога жыхарам Усходняй Еўропы.

«Звесткі аб гістарычных назвах гродзенскіх вуліц збіраліся апошнія 10 гадоў, — патлумачыў Андрэй Вашкевіч, — над гэтым працавалі такія нашы гісторыкі, як Юрый Гардзееў, Алесь Госцеў, Віталь Карнялюк, Юрый Саяпін, які, на жаль, нядаўна пакінуў нас. У пошуку старажытных назваў дапамаглі фонды нашага музея, дзе сабраны багаты картаграфічны матэрыял».

Было вырашана, што дадатковыя звесткі пра вуліцу павінны быць на беларускай мове. Гэта патрабавала пэўнага часу, каб выверыць правільнасць іх напісання. Акрамя назвы, указаны перыяд яе ўжывання. Па форме шыльды нагадваюць таблічкі на гістарычных аб'ектах.




Фота БЕЛТА.

Першая з'явілася на вуліцы Савецкай, якую можна назваць рэкардсменкай па колькасці назваў. Нам вядома пра пяць — Віленскі гасцінец, Віленская, Гімназіяльная, Саборная, Дамініканская. На чарзе — уладкаванне таблічак на вуліцах Карла Маркса, Кірава, Урыцкага, Ажэшкі, Вялікай Траецкай, Гараднічанскай. Адказвае за ўстаноўку і выраб шыльдаў гарадская жыллёва-камунальная гаспадарка. А ідэю падказалі самі жыхары, якія выйшлі да гарадскіх уладаў з адпаведнай петыцыяй.

Пакуль размова ідзе пра 16 цэнтральных вуліц, работу на якіх плануецца завяршыць да пачатку турыстычнага сезона. Ёсць намер аздобіць шыльдамі з гістарычнымі назвамі яшчэ каля 30 вуліц Гродна. Разам з гэтым рыхтуецца да ўстаноўкі інфармацыйныя стэнды з арыенцірамі галоўных архітэктурных помнікаў, якія будуць прадубліраваны на англійскай мове.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# ЗАЛАТЫЯ ВАЛАСЫ І АЛМАЗЫ Ў ЗУБАХ,

## або Якія жанчыны лічыліся самымі прыгожымі ў старажытныя часы

**Ва ўсе часы і ва ўсіх краінах былі свае ідэалы жаночай прыгажосці. У розныя часы шанаваліся розныя яе аспекты, усё гэта мянялася з надыходам нейкай новай эпохі, што з'яўлялася канонам «учора», «сёння» ўжо губляла сваю сілу і прывабнасць. Асабліва няпроста было жанчынам у старажытным свеце. Калі наша сучасніца чарговы раз пачне сумнявацца ў сваёй прывабнасці, ёй трэба ўспомніць аб тым, наколькі ўсё гэта адноснае і складана было на пачатку часоў.**



Ужо ў **дагістарычны перыяд** людзі, акрамя прадметаў побыту, ляпілі з гліны чалавечыя фігуркі. Узрост самай старажытнай жаночай статуэткі, вядомай чалавецтву — 80 тысяч гадоў. Першыя прадметы культуры адлюстроўвалі менавіта жанчыну, якая была кіраўніком роду, узносілася да рангу мацi багоў. Якія патрабаванні былі да ідэалу жаночай прыгажосці ў той час, і хто быў «заканадаўцам моды»? Фігуркі палеалітычных «Венер» паказваюць, што цікавасць да жанчыны трыццаць тысяч гадоў таму вельмі адрознівалася ад цяперашняй. Твар, рукі і ногі прапрацаваны ў гэтых фігурак вельмі слаба. Часам уся галава складаецца з адной пышнай прычоскі, але вось усё, што мае дачыненне да нараджэння і кармлення дзіцяці, — усё гэта не проста старанна прапісана, але, як здаецца, перабольшана. Кароткае тулава, велізарныя гіпертрафаваныя грудзі, уздуты жывот, масіўныя сцёгны, маленечкія рукі і ногі — усё гэта сведчыць пра культ пладавітасці жанчыны. Прыгажосць і выжыванне цесна звязаны паміж сабой у паданнях аб першым жаночым ідэале.

Прыгажуня **Старажытнага Егіпта** — гэта стройная жанчына з шырокімі плячыма, невялікімі грудзьмі, тонкай таліяй, даволі вузкімі сцёгнамі, але без празмернай худзізны. Валасы ў егіпцянкі абавязаны былі быць пышнымі, але толькі не на целе, і ў Егіпце была ў модзе васковая эпіляцыя. Ідэалам прыгажосці была стройная і грацыёзная жанчына з поўнымі вуснамі, прамым носам і велізарнымі міндалепадобнымі вачыма. Каб пашырыць зрэнкі і надаць бляск вачам, капалі ў іх сок беладоны. Самым прыгожым колерам вачэй лічыліся зялёны, але гэта была рэдкасць. У Старажытным Егіпце жанчыны падводзілі вытанчанай рысай бровы да скроняў чорнай тушшу, атрыманай з сумесі попелу,



сажы, вокісаў медзі і сульфіду свінцу. Егіпцянкі былі перакананы, што гэтым яны прадухіляюць хваробы і няшчасці. Справа ў тым, што ў значнай ступені гэта сапраўды была абарона вачэй ад яркага сонца. У мэтах абароны іх жа ад пяску яны падвужалі свае вейкі — гэта абавязкова рабілі на святы і выхадных. Вусны егіпцянкі падфарбоўвалі чырвоным фарбавальнікам, прыгатаваным з сумесі ёду, брому і разнастайных раслінных фарбавальнікаў. Валасы шанаваліся гладкія, колеру крумкачовага крыла. Верхам вытанчанасці і грацыёзнасці лічылася цяжкая высокая прычоска, калі галава вылучалася на падкрэслена доўгай шыі. Кантраст цяжкіх прычосак з вытанчанай выцягнутай фігурай выклікаў уяўленне аб экзатычнай расліне на гнуткім раскалыханым сцябле. Для завяршэння вобраза фарбавалі ў зялёны пазногці на руках і ступні ног.

Не менш чым пра свой твар, егіпецкія жанчыны клапаціліся і пра цела. Яны прымалі ванны з араматычнымі алеямі, насілі лёгкую, амаль празрыстую вопратку і выкарыстоўвалі ў якасці касметыкі натуральныя прадукты. Скура павінна была быць светла-бронзавага колеру, для гэтага існавала асобная фарба, якой яе пакрывалі. Каб захаваць вільгаць скуры, яны накладвалі на яе маскі з алею горкага міндаля, лісце салаты, кмена і лілей. Каб яшчэ больш змякчыць скуру, егіпцянкі выкарыстоўвалі мёд. Паводле легенды, Клеапатра прымала ванны з малака з раствораным у ім мёдам. Яшчэ ў 1500 г. да н. э. у Егіпце выкарыстоўвалі мыла, якое варылі з тлушчаў жывёл, агародніны і солі. Егіпецкія жанчыны фарбавалі валасы хной, а пазнеі, для лепшай гігіены, на свае коратка стрыжаныя або голеныя валасы сталі надзяваць парыкі.



У **Старажытнай Грэцыі** стварылі свой эстэтычны ідэал не столькі на базе прыгажосці, колькі чыстай гармоніі, ідэальных прапорцый і фізічнай дасканаласці цела. Гэтая прыгажосць жанчыны выяўлялася ў лічбах: рост — 164 см, акружнасць грудзей — 86 см, талії — 69 см, сцёгнаў — 93 см (параметры статуі Афрадыты (Венеры) Мілоскай). Вельмі прыгожым лічыўся твар, які можна было падзяліць на некалькі роўных частак (тры ці чатыры). У модзе была прыгажосць строгая і высакародная. Перш за ўсё шанаваліся блакітныя вочы, залатакудрыя валасы і светлая, бліскучая скура. Для надання твару белізны прывілеяваныя грачанкі выкарыстоўвалі бяліла, лёгкія румяны наносілі кармінам — чырвонай фарбай з кашанілі, выкарыстоўвалі пудру і губную памаду. Для падвядзення вачэй — сажай ад згарання спецыяльнай эсенцыі. Жанчыны Грэцыі, як правіла, валасы не абразалі, яны ўкладвалі іх вузлом або перавязвалі на патыліцы стужкай. «Антычны вузел» увайшоў у гісторыю прычоскі і да гэтага часу знаходзіць сабе прыхільнікаў.

Догляд за целам быў неадчэпнай ідэяй грэкаў. Ён уключаў у сябе працяглыя наведванні лазняў і басейнаў, прыняцце ваннаў з рознымі напаўняльнікамі і травой і масаж з араматычнымі алеямі. Выключэннем з гэтага правіла была толькі Спарта, дзе лічылася, што выкарыстанне касметыкі з'яўляецца амаральным і, такім чынам, было забаронена. У Афінах жанчыны з прыстойнай сям'і не рабілі сабе макіяж. Пасля грэка-персідскіх войнаў у грэчаскае грамадства пачала ўрывацца мода з усходу, і афінянкі пачалі выкарыстоўваць прынятыя там касметычныя сродкі. З тых часоў і сталі вядомыя «грэчаскія бровы». Грачанкі надавалі ім яркі бляск пры дапамозе сумесі яечнага бялку і камедзі і злучалі іх разам на пераносці чорнай тоўстай лініяй. Высокі рост жанчыны быў яшчэ адным эталонам грэчаскай прыгажосці. А вось асноўным недахопам для грэчаскай дзяўчыны лічылася захапленне ласункамі, і грэчаскі жаніх меў поўнае права адмовіцца ад нявесты, калі даведваўся пра гэты грэх.

Рымляне ад грэкаў у сэнсе канонаў адышлі недалёка — дакладней, яны проста скапіравалі эленскія ўзоры. Праўда, ідэал прыгажосці ў **Старажытным Рыме** абзавёўся гарбінкай на носе, якую з тых часоў прынята лічыць арыстакратычнай. Ідэальнай рымлянцы прадпісвалася быць статнай, мажной, але ні ў якім разе не худой. Аднак паўната патрабавалася зусім не друзлая, постаць павінна была захоўваць грацыёзнасць і стройнасць. Для рымлянак, шкілет якіх быў генетычна танчэйшы, чым у грачанак, выканаць гэтую ўмову было нялёгка. Яны актыўна займаліся фізічнымі практыкаваннямі, а таксама туга бінтавалі грудзі і сцёгны.

У Старажытным Рыме быў культ светлай скуры і бялявых валасоў. Жонкі рымскіх патрыцыяў для догляду скуры, акрамя адбельвальных мазяў, сродкаў супраць сухасці скуры, маршчын і вяснушак, ужывалі малако, вяршкі і малочнакіслыя прадукты. Падчас падарожжаў, акрамя світы, іх суправаджаў статак асліц, у малацэ якіх яны купаліся. Рымлянкі ўжо ведалі сакрэт абясколервання валасоў: іх праціралі губкай, змочанай маслам з казінага малака і попелам букавага дрэва, а затым абясколервалі на сонцы. Светлыя кучаравыя валасы лічыліся ідэалам прыгажосці, і рымскія цырульнікі прыдумлялі разнастайныя завіўкі.

Касметычныя сродкі для штодзённага туалета багатых рымскіх дам выраблялiся ў хатніх умовах, а догляд скуры і валасоў праводзілі спецыяльна навучаныя маладыя рабыні пад наглядам пажылых і спрактыкаваных кабет. Для вачэй выкарыстоўвалі сурмы, попел, сок шафрана — тое, што было папулярна і ў



Старажытнай Грэцыі. Рымляне, дарэчы, былі знаўцамі гігіены, яны шырока практыкавалі масаж і частыя купанні ў лазнях (тэрмах), дзе была халодная і гарачая вада, ванны, парныя, пакоі адпачынку і гімнастычныя залы. У пагоні за прадаўжэннем сваёй маладосці рымскія жанчыны наносілі сабе вялікую шкоду. Свінцовыя бялілы, за якімі яны хавалі свае маршчыны, убіраліся скурай, парушаючы ў арганізме абмен рэчываў. Гэта прыводзіла да выпадзення зубоў і пачарнення скуры. Але быў і менш небяспечны спосаб схаваць недахопы і адбяліць твар — парашок з ячнай мукі, бялкоў, соку нарцыса, мёду і смалы каўчукавага дрэва.

Дарэчы, у Старажытным Рыме ў эпоху яго «росквіту» з'явілася першая эпіляцыя. Цела папярэдне распарвалі ў лазні, пасля чаго спецыяльнай скрабніцай выдалялі ўсе валасінкі, а на твары іх вышчыпвалі маленькімі шчыпчыкамі, прычым працэдура ў той час была вельмі балючай.

**Індзейцы майя** лічылі, што Усявышні стварыў жанчыну непрывабнай, таму стараліся выправіць гэтую памылку. Для гэтага жанчыны майя татуявалі цела, уціраючы ў скуру чырвоную мазь, у якую дадавалі вельмі ліпкую і пахкую смалу — сціранс. Гэтай сумессю змазвалі асаблівы брусок, упрыгожаны ўзорамі, і націралі ім грудзі, рукі, плечы, становячыся, як ім здавалася, вельмі дагледжанымі і прыемна пахнучымі. Свой твар жанчыны падфарбоўвалі чырвонай фарбай. Тут можна было сустрэць і пірсінг у самых нечаканых месцах, і галаўныя аксесуары з каменю, якія важылі некалькі кілаграмаў.

Акрамя гэтага, у старажытных майя быў свой адмысловы ідэал прыгажосці, які адрозніваецца ад усіх іншых народаў. У іх высока шанаваўся доўгі і адхілены назад чэрап, які фармавалі ў немаўлят з дапамогай дзвюх дошчачак. Таксама майя лічылі ідэальным лоб, які ўтвараў прамы кут з носам. Для гэтага яны прыдумалі адмысловы прэс, які сціскваў чэрап такім чынам, што паступовa форма галавы станавілася такой, якой патрабавала мода. Твар павінен быў быць вузкім, са скуламі, якія выдаюцца акруглым падбародзем, якое выступала ўперад, і маленькім ротам. Таксама неад'емнай прыкметай прыгажосці былі раскосыя вочы. Касавокасць расцэньвалася ў іх як элемент жаночай прыгажосці. Калі ў сям'і нараджалася дзяўчынка, яе бацькі ўсталёўвалі на падстаўку шары. Чым больш было шарыкаў падчас качання дзіцяці, тым больш прaяўлялася ў яго касавокасць. Але яна гарантавала будучую папулярнасць нявесты сярод юнакоў. Акрамя гэтага, старажытныя майя падпілоўвалі сабе зубы і інкруставалі іх каштоўнымі камянямі. Касавокая, прыжмураная дзяўчына з чырвоным тварам і алмазамі ў зубах была гарачай жанчынай, марай мужчыны племені майя.



**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**

---

Даты | Падзеі | Людзі

### 7 САКАВІКА

**1876** год — амерыканскі вынаходнік Аляксандр Бэл атрымаў патэнт на вынайдзены ім тэлефонны апарат.

**1887** год — нарадзіўся Усевалад Сцяпанавіч Фальскі, беларускі грамадска-палітычны, дзяржаўны і культурны дзеяч, акцёр, адзін са стваральнікаў беларускага прафесійнага тэатра. Удзельнічаў у арганізацыі і быў старшынёй Першага таварыства беларускай драмы і камедыі, Мінскага таварыства працаўнікоў мастацтва. У 1919 годзе займаў пасаду камісара замежных спраў Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі. Дата смерці невядома.

**1912** год — нарадзіўся (в. Шайцерава, цяпер у Верхнядзвінскім раёне) Тарас Хадкевіч, беларускі пісьменнік. Заслужаны работнік культуры Беларусі. Аўтар раманаў «Даль палявая», «Песня Дзвіны», зборнікаў апавяданняў «Сяброўства», «Сад у квецені» і іншых. Адзін з аўтараў кнігі «Мы раскажам пра Мінск». На беларускую мову перакладаў творы М. Горкага. Памёр у 1975 годзе.

**1918** год — нарадзіўся (в. Чарэя Чашніцкага раёна) Яўген Піліпавіч Іваноўскі, савецкі военачальнік, генерал арміі, Герой Савецкага Саюза. У гады Вялікай Айчыннай вайны з 1941 года — на Заходнім, Сталінградскім, Варонежскім, 1-м і 2-м Беларускіх франтах. Удзельнік баёў пад Масквой, Сталінградам, Курскам, вызвалення Украіны, Польшчы, Усходне-Прускай аперацыі. У 1945—1956 гадах — на адказных пасадах у Савецкай Арміі. З 1980 года — камандуючы войскамі БВА, з 1985-га — галоўнакамандуючы сухапутнымі войскамі — намеснік міністра абароны СССР. Памёр у 1991 годзе.

**1922** год — нарадзіўся (в. Слабодчына Мінскага раёна) Вітольд Міхайлавіч Гінтаўт, Герой Савецкага Саюза (1944). У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях на Калінінскім напрамку, пад Ржэвам, у Курскай бітве, вызваленні Украіны, Польшчы, Румыніі, у баях у Германіі. Праявіў сябе ў баі пад Вінніцай (Украіна): знішчыў 6 варожых танкаў, самаходную гармату. Памёр у 1987 годзе.




**1960** год — у СССР быў сфарміраваны першы атрад касманаўтаў, калі ў Цэнтр прыбылі першыя дванаццаць чалавек з ліку ваенных лётчыкаў: Іван Анікееў, Валерый Быкоўскі, Барыс Валынаў, Юрый Гагарын, Віктар Гарбатка, Уладзімір Камароў, Аляксей Лявонаў, Рыгор Нялюбаў, Андрыян Нікалаеў, Павел Паповіч, Герман Цітоў і Георгій Шонін.

**Было сказана**

**Эльчын САФАРЛІ, азербайджанскі пісьменнік, журналіст:**
*«Чым больш ты чакаеш, тым большая імавернасць, што ты чакаеш не тое».*

## Белинвестбанк

С 07.04.2017 ОАО «Белинвестбанк» в одностороннем порядке уменьшает размер процентных ставок по срочным банковским вкладам (депозитам) физических лиц в белорусских рублях по следующим видам договоров срочных банковских вкладов (депозитов), заключенных в срок до 15.02.2017, и устанавливает их в следующих размерах:

*% годовых*

| | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| «Срочный банковский вклад (депозит) «Пенсионный», размещенный до 12.11.2015 | 2 года |
| | 10,0% |

| | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| «Срочный отзывный банковский вклад (депозит) «Пенсионный», размещенный в период с 23.12.2015 до 15.02.2017 | 2 года |
| | 9,5% |

| | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| «Срочный безотзывный банковский вклад (депозит) «Пенсионный», размещенный в период с 23.12.2015 до 01.04.2016 | 1 год |
| | 12,0% |
| «Срочный безотзывный банковский вклад (депозит) «Пенсионный», размещенный в период с 01.04.2016 до 15.02.2017 | 12,5% |

| | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| «Срочный банковский вклад (депозит) «Универсальный», размещенный до 15.05.2015 | 2 года |
| | 6,5% |

| | Срок вклада (депозита) | | |
|---|---|---|---|
| «Срочный банковский вклад (депозит), размещенный до 12.11.2015 | 12 мес. | 36 мес. | 60 мес. |
| | 10,0% | 11,0% | 12,0% |
| | | | |
| «Срочный безотзывный банковский вклад (депозит), размещенный в период с 19.11.2015 до 15.02.2017 | Срок вклада (депозита) | | |
| | 12 мес. | 24 мес. | 36 мес. |
| | 10,5% | 11,0% | 11,5% |

| | Срок, по истечении которого допускается снятие всей суммы вклада (депозита) без потери процентов, и размер процентной ставки в зависимости от указанного срока | | | |
|---|---|---|---|---|
| «Срочный банковский вклад (депозит) с правом востребования», размещенный до 12.11.2015 | 3 мес. | 6 мес. | 12 мес. | 36 мес. |
| | 8,0% | 8,5% | 9,0% | 9,5% |

| | Срок вклада (депозита), по истечении которого допускается снятие всей суммы без потери процентов, и размер процентной ставки в зависимости от указанного срока | | | |
|---|---|---|---|---|
| «Срочный отзывный банковский вклад (депозит) с правом востребования», размещенный в период с 19.11.2015 до 15.02.2017 | 3 мес. | 6 мес. | 12 мес. | 36 мес. |
| | 8,0% | 8,5% | 9,0% | 9,5% |

| «Срочный банковский вклад (депозит) «Личный выбор», размещенный до 12.11.2015 | | | Срок вклада (депозита) | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 год | 2 года | 3 года |
| Условия частичного снятия денежных средств | % частичного снятия | % остатка средств во вкладе (депозите) | Процентная ставка | | |
| | 90% | 10% | 9,0% | 10,0% | 11,0% |
| | 50% | 50% | 9,5% | 10,5% | 11,5% |
| | 10% | 90% | 10,0% | 11,0% | 12,0% |

| | Срок вклада (депозита) | | |
|---|---|---|---|
| «Срочный безотзывный банковский вклад (депозит) «Личный выбор», размещенный в период с 19.11.2015 до 15.02.2017 | 1 год | 2 года | 3 года |
| | 10,5% | 11,0% | 11,5% |

| | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| «Срочный отзывный банковский вклад (депозит) «Активный», размещенный в период с 19.11.2016 до 15.02.2017 | 360 дней |
| | 6,0 % |

По договорам срочных банковских вкладов (депозитов) в белорусских рублях, заключенным посредством системы Интернет-банкинг в период проведения акции «Интерактивные недели в Белинвестбанке», сохраняется увеличение процентной ставки, установленной по соответствующему виду вклада (депозита), на 1 процентный пункт.

По договорам срочных банковских вкладов (депозитов) в белорусских рублях, заключенным посредством системы Интернет-банкинг в период с 03.01.2017 до 15.02.2017, сохраняется увеличение процентной ставки, установленной по соответствующему виду вклада (депозита), на 0,5 процентных пункта.

146
www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. УНП 807000028. Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь №3 от 03.06.2013


# Объявление
## о торгах

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот №1. Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-4593, расположенное по адресу: Витебская обл., Городокский район, Пальминский с/с, д. Шпаково, д. 26 площадью 29,5 кв. м, наименование – жилой дом. Составные части и принадлежности: сени, веранда, три сарая – 1530 белорусских рублей; |
| **Собственник (владелец) имущества** | Гопанков Олег Анатольевич |
| **Наличие обременений** | |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская обл., Городокский район, Пальминский с/с, д. Шпаково, д. 26 |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 17.03.2017 в 11.00<br>г. Городок, ул. Советская, 14 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения Городокского района управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (211573, г. Городок, ул. Советская, 14, ispgorodok@tyt.by)<br>Судебный исполнитель отдела: Леонов Михаил Юрьевич, тел/факс. (802139) 50840 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Городокского района управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903007305 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, не позднее 14.00 16.03.2017 г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

# ОБЪЯВЛЕНИЕ

**ОАО «БЕЛФА» г. ЖЛОБИН ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 30 марта 2017 г. ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета за 2016 год.
3. О результатах проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.
4. Утверждение годового отчета: бухгалтерского баланса и приложений к нему за 2016 год.
5. Об источнике покрытия убытков общества за 2016 год.
6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (после уплаты налогов, сборов (пошлин), других обязательных платежей) на 2017 год и первый квартал 2018 года.
7. Избрание членов Наблюдательного совета Общества и ревизионной комиссии.
8. О размерах вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

**Собрание состоится в конференц-зале Общества по адресу: проезд Красный, 2, г. Жлобин, Гомельская область.**

**Начало в 10.00.**

**Регистрация участников собрания с 08.15 до 09.45.**

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**
**акционеру Общества – паспорт,**
**представителю акционера – паспорт и доверенность.**

**Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, составляется на основании данных реестра владельцев акций по состоянию на 1 марта 2017 года.**

**С материалами по проведению собрания можно ознакомиться по месту нахождения Общества с 15 марта 2017 года.**

УНП 400076540 **Наблюдательный совет**

# ИЗВЕЩЕНИЕ

**о повторном открытом аукционе по продаже имущества УПУП «Гродненская областная автошкола» 28 марта 2017 года**

| | |
|---|---|
| **Вид аукциона** | Открытый |
| **Предмет аукциона** | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-108917 (целевое назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – платная автостоянка) площадью 2852,8 кв. м. В состав объекта входят: покрытие территории (асфальтобетон, бетон), бордюр для отделения проезжей части, ограждение из металлической сетки, домик для дежурных, хозяйственный сарай, металлический сарай, смотровая яма, туалет). Год постройки – 1978 |
| **Начальная цена продажи** | **66 600 рублей (с учетом НДС 20%)** |
| **Кадастровый номер земельного участка и вид вещного права** | **440100000002002100,**<br>право временного пользования |
| **Месторасположение земельного участка** | Гродненская область, г. Гродно, ул. Белуша, д. 45 |
| **Размер земельного участка** | **0,3300 га** |
| **Продавец** | Учебно-производственное унитарное предприятие «Гродненская областная автомобильная школа» общественного объединения «Белорусское общество автомотолюбителей» г. Гродно, пр. Космонавтов, д. 41Б, тел./факс 8-10+(375)-0152-75-07-57 |
| **Организатор аукциона** | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 720537, 720546 |
| **Дата проведения аукциона** | **28 марта 2017 года** |
| **Время проведения аукциона** | **12.00** |
| **Место проведения аукциона** | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| **Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов** | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 57 |
| **Дата и время начала приема документов** | 6 марта 2017 года 8.00 |
| **Дата и время окончания приема документов** | 22 марта 2017 года 17.00 |
| **Сумма задатка** | **8 880 рублей** |
| **Шаг аукциона** | 5 % |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000041810 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: www.grodno.gov.by

УНП 500227068

Открытое акционерное общество

# «РАДИОТЕХНИКА»

**проводит очередное общее собрание акционеров 30 марта 2017 года**

в 14.00 по адресу: Гродненская обл., г.Ошмяны, ул. Я. Колоса, д. 1.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Радиотехника» за 2016 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2017 год.
2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Радиотехника» о проделанной работе в 2016 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности ОАО «Радиотехника», распределения прибыли и убытков ОАО «Радиотехника» за 2016 год.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности ОАО «Радиотехника» за 2016 год.
5. Об утверждении распределения и использования чистой прибыли (убытков). О выплате дивидендов за 2016 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2017 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии ОАО «Радиотехника».
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Радиотехника».
9. О внесении изменений в устав ОАО «Радиотехника».

Собрание проводится в очной форме. Время начала регистрации – 13.30. Акционеру иметь при себе паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – по состоянию реестра на 20.03.2017. Акционеры могут ознакомиться с материалами по собранию в рабочие дни, начиная с 21.03.2017 у председателя наблюдательного совета.

## Приорбанк RZB Group

**«ПРИОРБАНК» Открытое акционерное общество, 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А, извещает своих акционеров, что 29 марта 2017 года в 10.00 состоится очередное Общее собрание акционеров банка.**

